Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

СТАР. 6

Вандроўка да казачных гномаў

СТАР. 8

Як «збегчы» ад спякоты

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 ЛІПЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 128 (27738) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

НАВУКА ЗАКАНАТВОРЧАСЦІ

Учора ў фае Авальнай залы Дома ўрада адбылася цырымонія падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Подпісы пад дакументам паставілі старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка і рэктар БДУ Сяргей Абламейка.

Пагадненне прадугледжвае шырокі спектр узаемадзеяння. У першую чаргу яно накіравана на стварэнне спрыяльных умоў для аналізу і навуковай экспертызы дзеючага заканадаўства і законапраектаў, над якімі працуюць дэпутаты, развіццё навукова-даследчай дзейнасці ў галіне права. У прыватнасці, супрацоўніцтва мае на ўвазе арганізацыю канферэнцый, семінараў і сімпозіумаў, абмен навуковай і метадычнай літаратурай, аналітычнымі і экспертнымі матэрыяламі, статыстычнымі і тэматычнымі базамі даных.

Фота БЕЛТА.

Акрамя таго, у рамках пагаднення запланаваны практыка і азнаямленчыя візіты студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў у Палату прадстаўнікоў, а таксама стажыроўка прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ і павышэнне кваліфікацыі дэпутатаў і работнікаў сакратарыята ніжняй палаты парламента.

— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і сёння супрацоўнічаюць з Беларускім дзяржаўным універсітэтам па пытаннях заканатворчай дзейнасці. Мэта падпісання пагаднення — вывесці гэтае супрацоўніцтва на больш высокі і сістэмны ўзровень, — пракаментаваў журналістам падзею **спікер ніжняй палаты парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Асноўныя кірункі, па якіх мы будзем працаваць разам — гэта перш за ўсё аналіз дзеючага заканадаўства, уняссенне неабходных змяненняў і дапаўненняў; другі кірунак — навуковая экспертыза заканадаўчых актаў, якія разглядаюцца ў Палаце прадстаўнікоў. Для нас вельмі важнае значэнне мае меркаванне вучоных, спецыялістаў у гэтай галіне, бо большасць дэпутатаў не з'яўляецца юрыстамі. Трэці кірунак — навукова-даследчая работа ў галіне права. Пагадненне таксама прадугледжвае ўдзел парламента ў рэалізацыі вучэбнага працэсу будучых юрыстаў.

Вынікам прыняцця гэтага дакумента павінны стаць больш якасныя законы і больш адкрытая дзейнасць парламентарыяў.

— У Беларускім дзяржаўным універсітэце сканцэнтравана краса беларускай юрыдычнай навукі, — дадаў **рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА.** — Тут працуе больш за 20 дактароў, вельмі шмат кандыдатаў; ёсць людзі, вядомыя ўсёй краіне. І мэта пагаднення — больш інтэнсіўна прыцягнуць іх для супрацоўніцтва ў галіне заканадаўства, падрыхтоўкі, аналізу законаў. Больш цесна працаваць з парламентам будуць і студэнты. Для іх гэта таксама вельмі важна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

АДНАЎЛЯЕЦЦА ЛІНЕЙКА СПАЖЫВЕЦКІХ КРЭДЫТАЎ

Найбуйнейшы банк Беларусі з 10 ліпеня пачаў зноў выдаваць крэдыты на спажывецкія патрэбы «Праверана часам» з выкарыстаннем крэдытнай банкаўскай аплатнай карткі, паведамляе прэс-служба Беларусбанка.

Названы крэдыт прадастаўляецца кліентам банка, якія атрымліваюць заработную плату і іншыя даходы на рахунку, адкрытыя ў аддзяленнях Беларусбанка, і мае шэраг пераваг у параўнанні з традыцыйнымі спажывецкімі крэдытамі. У гэтым выпадку чалавеку даецца міжнародная крэдытная банкаўская плацежная картка з магчымасцю зняцця наяўных грашовых сродкаў. Крэдытная лінія з'яўляецца аднаўляльнай да дасягнення крэдытаатрымальнікам 57-гадовага ўзросту з магчымасцю павелічэння гранічнага памеру крэдытнай лініі ў перыяд карыстання крэдытам.

Акрамя таго, аднаўляецца выдача фізічным асобам крэдытаў на спажывецкія патрэбы тэрмінам ад 1 да 5 гадоў з выкарыстаннем крэдытнай банкаўскай аплатнай карткі.

Сяргей КУРКАЧ.

БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ!

Фота БЕЛТА.

Акцыянернае таварыства «Фірма «Кадзіна» першым у Магілёўскім раёне прыступіла да ўборкі ранніх сартоў бульбы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «БРСМ»:

«Ёсць ідэя ўвесці ў нарматыўна-прававую базу пэўныя прэферэнцыі для прадпрыемстваў, якія бяруць на працу будатрады. Магчыма, гэтыя льготы закрануць адлічэнні прадпрыемства ў фонд сацыяльнай абароны. Працуючы, мы выхоўваем моладзь, выхоўваем тое пакаленне, якое працуе на будучыню краіны. Традыцыі будатрадаў адраджаюцца ў Беларусі ў апошнія гады. Чалавек працы — гэта прынцып работы будатрадаў, тыя традыцыі, якія мы павінны захаваць і ўважліва да іх ставіцца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.07.2014 г.

Долар ЗША	10240,00	▲
Еўра	13960,00	▲
Рас. руб.	302,50	▲
Укр. грыўня	877,84	▼

Фота БЕЛТА.

«БАЗАР» ЧАКАЕ АНШЛАГАЎ

ФЕСТЫВАЛЬ У ВІЦЕБСКУ ТОЛЬКІ ПАЧАЎСЯ, А НА НЕКАТОРЫЯ КАНЦЭРТЫ БІЛЕТАЎ УЖО НЕ КУПІЦЬ

Учора афіцыйна стартаваў XXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Цікава, што калі сёлета, толькі па папярэдніх прагнозах, фэст акупіць сябе прыкладна на 77%, у наступным годзе — ужо на ўзроўні 94%, а ў 2016 годзе плануецца «вывесці» «базар» на поўную самаакупнасць.

Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, старшыня арганізацыйнага камітэта фэсту, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, паставіў самую высокую ацэнку працы дырэкцыі «базару» і кіраўніцтва мясцовай улады.

— Добра спрацавалі ў перыяд падрыхтоўкі да фэсту. Дзякуй за гэта асабіста дырэктару і ўсім яго падначаленым. І ўвесь горад да фестывалю добра падрыхтаваўся, — сказаў ён.

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што летась «базар» «разгарнулі» ў бок тэлегледача. Для гэтага былі задзейнічаны самыя прафесійныя супрацоўнікі тэлебачання, тыя, хто займаюцца дызайнам, афармленнем сцэны летняга амфітэатра — галоўнай сцэнічнай пляцоўкі фэсту.

Паводле яго слоў, нягледзячы на тое, што «базар» стаў менш працяглым: афіцыйна ён доўжыцца ўсяго толькі пяць дзён, але кожны з іх насычаны падзеямі: у праграме больш за 80 мерапрыемстваў.

Сёлета фестывальныя падзеі асвятляюць больш за 500 журналістаў з 12 краін. Каб адзначыць самыя лепшыя праграмы і артыкулы, на фэсце будзе адроджана традыцыя ўручэння журналістам спецыяльнага прыза «Залатое пяро».

— Сярод прадстаўнікоў СМІ, акрамя беларускіх, журналісты з Арменіі, Германіі, Ізраіля, Латвіі, Расіі, Украіны і іншых краін. Аўтараў найлепшых публікацый і перадач мы хацелі б адзначыць на наступным фестывалі ў рамках адкрыцця ўжо XXIV фестывалю, — адзначыла **Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі.**

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

Зорка Надзеі БАБКІНАЙ стала дзясятай на Алеі лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі.

■ Надвор'е

МОЦНЫЯ ЛІЎНІ І НАВАТ ГРАД

На выхадныя — зноў плюс 30

У бліжэйшыя дні на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць актыўныя атмасферныя франты цыклону, які перамяшчаецца з Балканскага паўвострава на паўночны ўсход Польшчы, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

Таму ў пятніцу амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы, месцамі прагназуюцца моцныя ліўні. Удзень у асобных раёнах магчымы град. Вецер паўночна-ўсходні ўмераны, пры навальніцах — парывісты. Стане больш воблачна і будзе крыху свяжэй. Максімальная тэмпература паветра ўдзень чакаецца ад 19 да 25 градусаў цяпла, а па паўднёвым усходзе да плюс 27 градусаў.

У суботу і ў нядзелю ўсталюецца паўднёва-ўсходні вецер, з якім на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш цёплае паветра з усходу Украіны. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 14–19 градусаў, удзень — ад 23 да 28 цяпла, а па паўднёвым усходзе месцамі чакаецца да плюс 30. І на выхадныя на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, месцамі — моцныя дажджы. Удзень у суботу ў многіх рэгіёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 метраў у секунду, у асобных раёнах магчымы град. Такі тэмпературны фон на 3–7 градусаў перавысіць кліматычную норму.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІЗРАІЛЬ І ГАЗА ЗНОЎ АБМЯНЯЛІСЯ РАКЕТНЫМІ ЎДАРАМІ

Узброенае супрацьстаянне Ізраіля і сектара Газа працягваецца ўжо які дзень. Учора зноў была зроблена спроба бамбіць Тэль-Авіў. Ракета, выпушчаная з сектара Газа, была збіта сістэмай проціпаветранай абароны «Жалезны купал». Акрамя таго, у другі раз за два дні ракеты былі выпушчаны ў бок ізраільскага ядзернага комплексу ў Дымоне. Іерусалім у даўгу не застаецца: у сектары падлічваюць колькасць ахвяр, якіх ужо дзясяткі. Інфармагенцтвы паведамляюць, што ізраільскія авіяўдары ў сераду ўзрушвалі Газу кожныя некалькі хвілін. Палесцінскія афіцыйныя асобы заявілі аб гібелі па меншай меры 47 чалавек. Паводле інфармацыі ВПС, з аўторка ў Палесцінскай аўтаноміі загінулі каля 60 чалавек; афіцыйныя асобы сцвярджаюць, што палова ахвяр — жанчыны і дзеці.

РАССАКРЭЧАНЫ ЯШЧЭ АДЗІН ШПІЁН ЗША Ў ГЕРМАНІІ

Рассакрэчаны напярэдадні яшчэ адзін амерыканскі шпіён у сілавых структурах ФРГ аказаўся супрацоўнікам Мінабароны Германіі, паведамляе Suddeutsche Zeitung. Паводле слоў экспертаў, гэты інцыдэнт нават больш сур'ёзны, чым затрыманне амерыканскага шпіёна ў разведупраўленні на мінулым тыдні. Акрамя таго, два раскрытыя шпіёны менш чым за месяц — гэта пагражае грандыёзным скандалам, які наўрад ці будзе садзейнічаць умацаванню нямецка-амерыканскіх адносін, і так нацягнутых пасля паведамленняў Сноўдэна. 2 ліпеня ў Берліне быў затрыманы першы фігурант справы — цяпер ужо былы супрацоўнік федэральнай разведвальнай службы Германіі, які за два гады супрацоўніцтва са спецслужбамі ЗША выкраў больш за дзве сотні сакрэтных дакументаў.

ФРАНЦУЗЫ САРВАЛІ ПЛАНЫ «АЛЬ-КАІДЫ» ПАДАРВАЦЬ ЭЙФЕЛЕВУ ВЕЖУ, ЛУЎР І АЭС



Ісламскія радыкалы планавалі ўчыніць серыю тэрактаў на тэрыторыі Францыі. Тэрарысты збіраліся атакаваць знакавыя культурныя аб'екты і мерапрыемствы — Эйфелеву вежу і Луўр у Парыжы і Авіньёнскі тэатральны фестываль. Акрамя таго, планаваліся выбухі ў барах, на рынках і напады на паліцэйскіх, разглядалася магчымасць атакі на АЭС. Падазроны ў падрыхтоўцы тэрактаў быў арыштаваны яшчэ год таму, аднак вядома пра гэта стала толькі 9 ліпеня — пасля таго, як французскі ўрад прадставіў шэраг мер, накіраваных на ўзмацненне барацьбы з тэрарызмам, піша Le Parisien.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

САМЫЯ НЕБЯСПЕЧНЫЯ — ГУМОВЫЯ ШЛЁПАНЦЫ

Шлёпанцы зручна насіць. Але яны шкодзяць нагам, калі насіць іх не на пляжы, а ў горадзе, папярэджваюць медыкі з Topical BioMedics. Большасць пар такога абутку не можа забяспечыць падтрымку зводу ступні, іхнаножныя мышцы расцягваюцца, ахілавы сухажыллі напружваюцца. Усё гэта выліваецца ў праблемы з суставамі ў каленях, сцёгнах і са спінай. У шлёпанцаў звычайна тонкая падэшва, таму нага мацней датыкаецца з зямлёй. Гэта небяспечна для костак і суставаў. Потым, з-за адсутнасці задніка прыходзіцца прыкладаць намаганні, каб утрымаць іх на назе. Вынік — магчымая страта раўнавагі. Шлёпанцы пагаршаюць стан пацыентаў з шышкамі на вялікіх пальцах ног і з падэшвенным фасцыітам. Што ўжо казаць пра раздражненне, выкліканае перамычкай, і інфекцыі! Часта ў аматараў такога абутку сустракаюцца парэзы. А гумовая падэшва становіцца ідэальным месцам размнажэння грыбкоў і бактэрый. У цэлым па ступені небяспекі са шлёпанцамі могуць параўнацца балеткі. Красоўкі можна насіць толькі са шкарпэткамі, інакш інфекцыі не пазбегнуць. А ад працяглага нашэння гумовага абутку наогул варта адмовіцца.

КАРОТКА

Сродкі дзяржаўнага фінансавага крэдыту Расіі ў суме $450 млн паступілі ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з заключаным 31 студзеня 2014 года пагадненнем паміж урадам Беларусі і ўрадам Расіі аб прадастаўленні беларускаму ўраду дзяржаўнага фінансавага крэдыту.

Інфляцыя ў Беларусі за чэрвень у параўнанні з маем 2014 года склала 1,2 працэнта. Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў чэрвені адносна мая 2014-га склаў 101,2 працэнта, снежня 2013-га — 110,2 працэнта.

На рэалізацыю трэцяй фазы праекта па стварэнні Нацыянальнай электроннай сістэмы збору платы за праезд па аўтадарогах Беларусі BelToll будзе накіравана 109 млн еўра інвестыцый аўстрыйскага канцэрна Kapsch.

Беларусь уваходзіць у лік лідараў сярод краін свету па доступе насельніцтва да медыцынскіх паслуг. Такія звесткі змешчаны ў дакладзе Сусветнай арганізацыі аховы здароўя «Сусветная статыстыка аховы здароўя 2014».

«СКАРБ УСІХ НА СВЕЦЕ ЛЮДЗЕЙ»

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА ЗАНЕСЕНА Ў СПІС ЮНЕСКА З НОВЫМІ МЕЖАМІ

Прыемная навіна прыйшла ў Нацыянальны парк «Белавежская пушча» і Белавежскі нацыянальны парк (Польшча) са сталіцы Катара Дахі. Камітэт Сусветнай спадчыны на чарговай 38-й сесіі прыняў сумесную заяўку Беларусі і Польшчы на ўключэнне тэрыторыі Белавежскай пушчы па абодва бакі мяжы як адзінага трансгранічнага аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Ён атрымаў новую назву — «Белавежская пушча», а яго плошча цяпер складае 141 885 гектараў.

Фота БЕЛТА.

Шлях да сусветнага прызнання аказаўся доўгім. Пра наш агульны нацыянальны сімвал ведаюць даўно не толькі ў нашай краіне. Сюды штогод едзе шмат турыстаў. Ім абавязкова расказваюць пра гісторыю знікнення і далейшага аднаўлення пушчанскага волата — зубра. Але не адным зубром славіцца пушча.

Пра самабытны куток нашай краіны сказана шмат, ды ніхто дагэтуль, здаецца, не сказаў лепш за Уладзіміра Караткевіча: «Гэта не толькі скарб усіх на свеце людзей. Галоўнае тое, што мы звязаны з чатырохногімі і пёрыстымі братамі нашымі адзінай повяззю еднасці ўсяго жывога на зямлі. Таму задача і гонар чалавека не забіваць, а бараніць і карміць. Ён зараз і робіць гэта, сапраўдны чалавек»…

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

■ Знешнепалітычны вектар

СКАРЫСТАЦЦА МАГЧЫМАСЦЯМІ Ў АФРЫЦЫ

Палату прадстаўнікоў наведала парламенцкая дэлегацыя Судана

На працягу гэтага тыдня ў нашай краіне з візітам знаходзіцца высокапастаўленая суданская дэлегацыя, на чале якой — намеснік **спікера Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Судан Іса БУШРА.** У склад дэлегацыі таксама ўваходзяць міністр сельскай гаспадаркі, члены парламента, прадстаўнікі банкаўскага сектара і бізнесу.

— Рэспубліка Судан для Беларусі з'яўляецца адным з ключавых партнёраў у Афрыцы, і сённяшні візіт высокай дэлегацыі дазваляе казаць пра далейшае развіццё сяброўскіх адносін па ўсіх кірунках, — звярнуўся да гасцей з вітальным словам **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар ГУМІНСКІ.** — Гэта добрая магчымасць пагаварыць пра наша міжпарламенцкае, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і іншых сферах, якія ўяўляюць узаемны інтарэс для абедзвюх краін.

Віцэ-спікер адзначыў, што апошнія кантакты на двухбаковым узроўні паміж парламентамі Беларусі і Судана адбыліся 7 гадоў таму, і надышоў час навярстаць упушчанае.

У сваю чаргу, Іса Бушра падзякаваў беларускаму боку за цёплы прыём і выказаў надзею на тое, што палітычныя і эканамічныя кантакты паміж Беларуссю і Суданам будуць умацоўвацца.

15 ліпеня спаўняецца 15 гадоў з дня ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і гэтай усходнеафрыканскай краінай.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЗБІРАЕМ БЕЛАРУСАЎ

Для рэалізацыі Закона «Аб беларусах замежжа» будзе створаны Кансультацыйны савет

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК. Нагадаем, што дакумент быў падпісаны Прэзідэнтам краіны 16 чэрвеня.

Падтрымка суайчыннікаў за мяжой

Законам вызначаны асноўныя прынцыпы, мэты і кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа ў мэтах забеспячэння салідарнасці беларусаў ва ўсім свеце, захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа і ўмацавання іх сувязяў з Беларуссю. «Што тычыцца нашых планаў па рэалізацыі закона, то міністэрства збіраецца да канца года распрацаваць палажэнне аб Кансультацыйным савеце пры МЗС, а таксама падрыхтаваць пасяджэнне гэтага савета», — заявіў Дзмітрый Мірончык. Улічваючы тое, што ў 2015 годзе скончыцца дзеянне дзяржаўнай праграмы «Беларусы ў свеце», верагодна, Кансультацыйны савет прыме актыўны ўдзел у распрацоўцы новых спосабаў узаемадзеяння з беларусамі за мяжой.

Дарэчы, да беларусаў замежжа адносяцца: грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за яе межамі; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і самі або іх продкі па прамой узыходзячай лініі нарадзіліся або пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці да беларускага народа або беларускай мовы, культуры, гістарычных сувязяў, ведання і захавання беларускіх традыцый і звычаяў.

Ізраіль і канфлікт ва Украіне

Вядома, што Беларусь даўно вядзе перамовы з Ізраілем наконт адмены візавага рэжыму. «Пры гэтым беларускі бок выразна зыходзіць з прынцыпу, што ніякая катэгорыя беларускіх грамадзян не можа быць дыскрымінавана падобным пагадненнем, — паведаміў Дзмітрый Мірончык. — Таму мы будзем зыходзіць з таго, што пагадненне з Ізраілем, як і з іншымі краінамі, будзе распаўсюджвацца на ўсіх беларускіх грамадзян».

Прэс-сакратар МЗС таксама пракаментаваў сітуацыю з паведамленнямі ў СМІ аб беларускіх грамадзянах, затрыманых ва Украіне. «У МЗС Беларусі не паступала афіцыйнай інфармацыі ўкраінскага боку аб затрыманні беларускіх грамадзян па абвінавачванні ў тэрарызме, падрыхтоўцы акцый пратэсту і іншых супрацьпраўных дзеянняў, — сказаў Дзмітрый Мірончык. — Паводле інфармацыі СМІ, у Адэсе былі затрыманы двое грамадзян Беларусі, і нашы замежныя ўстановы аператыўна рэагавалі на падобныя паведамленні, падтрымлівалі і падтрымліваюць цесны кантакт з украінскімі праваахоўнымі органамі». Ён удакладніў, што, па наяўных звестках, адзін з названых грамадзян з 1 ліпеня ўжо знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, а другі — з 5 ліпеня на тэрыторыі Расіі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Чалавек справы

ДОБРЫ КІРАЎНІК: СЯМЕЙНЫ І АДКАЗНЫ

АБРАНА 12 САМЫХ ПАСПЯХОВЫХ ТОП-МЕНЕДЖАРАЎ І ЎЛАДАЛЬНІКАЎ БІЗНЕСУ Ў БЕЛАРУСІ

Конкурс «Чалавек справы» ў дзевятнаццаты раз арганізавала рэдакцыя часопіса «Дело (Восток + Запад)». Як было адзначана на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання, лаўрэаты 2014 года — сапраўдныя лідары, сваім прыкладам здольныя інтэлектуальна запаліць таленавітых пачаткоўцаў бізнесу. Гэтыя людзі робяць стаўку на інавацыі, сучасныя тэхналогіі вытворчасці і маркетынгу, на эканамічнасць і высокую якасць прадукцыі. Для іх гэта шлях да дасягнення той высокай планкі, якую яны першапачаткова ставяць для сябе і свайго бізнесу: быць першымі, лепшымі ў сваім сегменце рынку, вядомымі і запатрабаванымі кліентамі.

Зразумела, што кожны раз пераможцамі конкурсу становяцца толькі самыя лепшыя. Аднак сёлета я заўважыў пэўную тэндэнцыю: амаль ўсе лаўрэаты гавораць аб тым, што бізнес можна весці паспяхова толькі пры сямейнасці (літаральна — адносінах да сваіх супрацоўнікаў, як да членаў сям'і), асабістай адказнасці кіраўніка і пастаянным удасканаленні прафесійных здольнасцяў работнікаў.

Напрыклад дырэктар ААТ «Навагрудскі завод газавай апаратуры» Віктар Турлюк (перамог у намінацыі «За стабільную і эфектыўную працу на беларускім і замежным рынках») кажа: «Я дырэктар з пэўнай доляй аўтарытарнага кіравання. Таму што даводзіцца часам прымаць не калегіяльныя рашэнні, а браць адказнасць на сябе. Але пры гэтым я чалавек каманды, якая можа высокапрафесійна справіцца з самымі складанымі задачамі». А старшыня савета дырэктараў ТАА «Інтэртрансаўта» Андрэй Смаляр (перамог у намінацыі «За важкі ўклад у развіццё знешнеэканамічных сувязяў Беларусі») сцвярджае, што яго бізнес пачаўся з трох патрыманых аўтамабіляў і чатырох супрацоўнікаў: «Даводзілася выконваць розную работу — начальніка, бухгалтара, менеджара, кіроўцы, слесара… Было цяжка, але жаданне развіваць бізнес дапамагло пераадолець цяжкасці».

Сяргей Радзівонаў, старшыня дырэкцыі ЗТАА «Капш Тэлематык Сэрвісіз» (перамог у намінацыі «За актыўнае прыцягненне і эфектыўнае выкарыстанне замежных інвестыцый») вылучае некалькі каштоўнасцяў, якія ляжаць у аснове ўстойлівасці кампаніі. Перш за ўсё, гэта сямейнасць: «Людзі — гэта асноўная і абсалютная каштоўнасць для кампаніі: «Капш Тэлематык Сэрвісіз» стварае ўсе магчымасці для развіцця кожнага работніка, найбольш поўнага выяўлення яго здольнасцяў і якасцяў». Генеральны дырэктар СЗАТ «Фідмаш» Алена Лапацентава (перамагла ў намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» ў сферы машынабудавання») таксама праводзіць паралелі з сям'ёй: «Тым, хто з намі працуе, важна наша надзейнасць. Для бізнесу ў мяне няма асаблівых правілаў паводзін. У сям'і, у быце, у працы дзейнічаюць, насамрэч, адны і тыя ж прынцыпы — быць адказным і добрасумленным».

Мікалай Місюк, дырэктар ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны камбінат» (перамог у намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» ў сферы харчовай прамысловасці») увогуле любіць сямейныя падрады на сваім прадпрыемстве: «У нас працуюць цэлымі сем'ямі. І калі дзеці нашых супрацоўнікаў прыходзяць да нас на працу — я з задавальненнем іх бяру. Бацькі, як ніхто іншы, навучаць сваіх дзяцей майстэрству. І дзецям будзе сорамна выконваць працу нядобрасумленна».

Дырэктар ААТ «Віцебскія дываны» Алена Чарапніна (перамагла ў намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» ў сферы лёгкай прамысловасці») замацоўвае чалавечыя якасці кіраўніка прафесійнымі: «Дырэктар павінен быць эканамістам не па адукацыі, а па перакананні. Для яго абаротныя сродкі — не эканамічны тэрмін, а жыццёва важная для прадпрыемства субстанцыя».

А словы генеральнага дырэктара ААТ «Прамагралізінг» Андрэя Пазняка (перамог у намінацыі «За ўклад у развіццё айчыннага рынку фінансавых паслуг») могуць стаць дэвізам для любога бізнесмена: «Дасягаючы адных мэт, трэба неадкладна ставіць перад сабою іншыя».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Меркаванне

Прагноз аб звужэнні рынкаў будаўнічых паслуг зрабіў лаўрэат прэміі конкурсу «Чалавек справы», генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Маналіт Груп» Мікалай Ермашоў.

Эксперт будаўнічага рынку адзначыў, што цяпер назіраецца ўплыў міжнароднага крызісу і на нашу эканоміку. Сёння перад краінай стаіць асноўная задача па прыцягненні інвестыцый менавіта ў прамысловасць і зніжэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля, спартыўных аб'ектаў, што, несумненна, уплывае на будаўнічы комплекс, упэўнены спадар Ермашоў.

Паводле яго слоў, у сувязі з гэтым прадпрыемства апошнія два гады праводзіць сур'ёзную дыверсіфікацыю кліенцкай базы. Сёння кампанія пачынае адыходзіць ад будаўніцтва толькі бюджэтных аб'ектаў і больш супрацоўнічае з прыватнымі заказчыкамі, буйнымі дэвелаперамі, вытворчымі прадпрыемствамі. Калі прадпрыемствы хочуць развівацца, то трэба разглядаць магчымасці працы і на замежных рынках. Цяпер існуюць рэальныя магчымасці выхаду на рынкі ў рамках Мытнага саюза і за яго межы, лічыць дырэктар.

Ён таксама адзначыў, што згортванне праграм ільготнага крэдытавання паўплывала на дзейнасць кампаніі. Зніжэнне аб'ёмаў работ для будаўнікоў тлумачыцца менавіта тым, што будаўніцтва па дзяржаўным заказе сёння не вядзецца ў неабходным маштабе. Мікалай Ермашоў падкрэсліў, што кампанія зноў вернецца на жыллёвы рынак у ранейшых аб'ёмах пасля таго, як усе нюансы будуць вырашаны ў сферы будаўніцтва па дзяржзаказе.

Сяргей КУРКАЧ.

«БАЗАР» ЧАКАЕ АНШЛАГАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У выніку добрай рэалізацыі квіткоў, прыцягнення грошай спонсараў штогод назіраецца памяншэнне бюджэтных сродкаў, якія накіроўваюцца на правядзенне фестывалю, — адзначыў **Барыс СВЯТЛОЎ, міністр культуры нашай краіны.**

Сёлета з бюджэту «базар» фінансуецца толькі на чвэрць. У тым ліку з рэзервовага фонду Прэзідэнта выдаткавана 6 мільярдаў рублёў, з бюджэту Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі — 4,5 мільярда рублёў. Сваю лепту ў фінансаванне таксама традыцыйна ўносяць і Міністэрства культуры, Віцебскі аблвыканкам. Агульны кошт фэсту — каля 43,6 мільярда рублёў.

— Збор ад продажу квіткоў на фестывалі — ужо 26 мільярдаў рублёў. Але, паколькі поўным ходам працягваецца іх рэалізацыя, гаварыць пра канчатковую лічбу яшчэ рана. Для параўнання, летась на гэтым зарабілі 22 мільярды рублёў. Яшчэ да афіцыйнага старту фестывалю на канцэртах у летнім амфітэатры быў поўны аншлаг, — адзначыў **Аляксандр СІДАРЭНКА, дырэктар міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Ён дадаў, што ўсяго за адзін дзень прадалі білетаў на 1 мільярд рублёў! Вельмі актыўна браніруюцца і купляюцца квіткі праз інтэрнэт. Сярод тых, хто такім чынам пажадаў убачыць канцэрты «базару», — жыхары ЗША, Новай Зеландыі, краін Паўднёвай Амерыкі.

Ужо раскуплены ўсе квіткі на канцэрты закрыцця «базару», прысвечаны 100-й гадавіне нараджэння Марка Фрадкіна. Набліжаецца да завяршэння продаж квіткоў на канцэрт гурта «Любэ», бенефіс Барыса Маісеева. Традыцыйна ў лідарах па продажы квіткі на гала-канцэрт дзіцячага конкурсу і спектаклі тэатральнай праграмы з удзелам «зорак».

У дырэкцыі падкрэслілі, што «базар» заўсёды па-за палітыкі. Таму ў ім традыцыйна бяруць удзел прадстаўнікі Расіі і Украіны. І прэзідэнты гэтых краін адправілі ў Віцебск тэлеграмы з прывітаннем — у сувязі з пачаткам фэсту. Усе «зоркі» мастацтваў першай велічыні заўсёды прыязджаюць на «базар» з задавальненнем. І сёлетні — не выключэнне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Палітычная пятніца з Аляксандрам Шпакоўскім

ДАСКАНАЛАСЦЬ МІРУ — У ПІЛЬНАСЦІ

УМАЦАВАННЕ ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ — НЕ МІЛІТАРЫЗМ, А ГАРАНТЫЯ БЯСПЕКІ ЦЫВІЛЬНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

Апошнім часам у беларускай інфармацыйнай прасторы шмат размоў пра нацыянальную бяспеку і абарону, што цалкам зразумела, калі ўлічваць вельмі няпростую ваенна-палітычную сітуацыю ў свеце, у тым ліку зусім блізка ад нашай мяжы — у суседняй Украіне.

Наведваючы 103-ю асобную гвардзейскую мабільную брыгаду сіл спецыяльных аперацый, Прэзідэнт чарговы раз звярнуў увагу на неабходнасць мадэрнізацыі тэхнікі і пераўзбраення беларускай арміі найноўшымі мабільнымі сродкамі. Адметным з'яўляецца той факт, што Беларусь не плануе набываць зброю за мяжой — такія задачы пастаўлены перад айчынным ваенна-прамысловым комплексам, дзе існуюць планы па арганізацыі вытворчасці баявых машын, верталётаў і нават самалётаў.

Супольны інтарэс

У гэтым кантэксце яшчэ адной падзеяй тыдня стала маштабная выстава ўзбраенняў MILEX-2014, што праходзіць у «Мінск-Арэне» з 9 па 12 ліпеня. Наведвальнікам прадстаўлены некалькі тысяч узораў вайсковай тэхнікі з больш чым 140 краін. На працягу мерапрыемства паміж арганізацыямі беларускага ВПК і партнёрамі былі падпісаны новыя кантракты, прадоўжаны тэрміны дзеяння раней заключаных дагавораў.

Зразумела, што выключна пад патрэбы айчыннай арміі немэтазгодна ствараць новыя лініі вытворчасці. Вельмі актуальным застаецца пытанне пашырэння экспарту ўзбраенняў, стварэння супольных ваенна-прамысловых ланцугоў, дзе ў якасці найбольш значнага партнёра для айчыннага ВПК разглядаецца Расія.

Паўнавартасны ўдзел у дзяржаўным абаронным заказе Расійскай Федэрацыі можа істотным чынам паўплываць на перспектывы развіцця вайсковай прамысловасці ў Беларусі. Яшчэ ў 2013 годзе гэтую праблему абмяркоўвалі на ўзроўні дзяржаўнага кіраўніцтва, у тым ліку на перамовах з віцэ-прэм'ерам Дзмітрыем Рагозіным, што адказвае за абаронна-прамысловую сферу ў расійскім урадзе. Між іншым, задача па ўключэнні беларускага прамысловага патэнцыялу ў абарончыя заказы Расійскай Федэрацыі з'яўляецца важнай не толькі для Беларусі, але і для Расіі, бо, апроч эканамічных меркаванняў, мае значэнне і для ўмацавання яе нацыянальнай бяспекі.

Як ні дзіўна, і цяпер, нягледзячы на існаванне праекта Саюзнай дзяржавы, айчынныя вытворцы ўзбраенняў па незразумелых прычынах выступаюць на расійскім рынку ў якасці замежных рэзідэнтаў. Асабліва цяжкія часы для беларускай «абаронкі» насталі ў перыяд, калі Міністэрствам абароны РФ кіраваў Анатоль Сердзюкоў: у той час нашы вытворцы выціскаліся з расійскага рынку на карысць больш дарагіх замежных аналагаў.

Калі казаць аб Беларусі, то знакаміты «беларускі балкон» і тыя самыя «800 кіламетраў да Масквы», што абараняе беларуская армія сёння, у рэчышчы падзей ва Украіне, набываюць зусім іншае гучанне нават у рыторыцы самых радыкальных расійскіх лібералаў.

Пагрозы тэхналагічнага эмбарга ў адрас Расіі з боку заходніх краін, спыненне супрацоўніцтва паміж ВПК РФ і Украіны вымушаюць расійскае кіраўніцтва іншым чынам паглядзець як на неабходнасць развіцця ўласных тэхналогій, так і на вытворчыя магчымасці бліжэйшых саюзнікаў. У гэтым шэрагу на першай пазіцыі, безумоўна, Беларусь, дзе захаваўся і развіваецца салідны комплекс вайскова-прамысловых актываў.

Упушчаны час ужо, на жаль, не вярнуць, але пашырэнне магчымасцяў беларускай вайсковай прамысловасці — абсалютна неабходны элемент бяспекі Саюзнай дзяржавы і ўсіх краін АДКБ, калі без залежнасці ад знешнепалітычнай кан'юнктуры ўзброеныя сілы саюзнікаў будуць атрымліваць якасную тэхніку і ўзбраенні. Да таго ж і грошы застануцца ў межах еўразійскай прасторы, дзе будуць працаваць на развіццё айчыннай навукі і адукацыі, а не асядаць на афшорных рахунках нячыстых на руку чыноўнікаў ды сумнеўных бізнесменаў.

Трансфармацыя ролі АДКБ

Іншым важным пытаннем, апроч ваенна-прамысловай кааперацыі, застаецца баявое ўзаемадзеянне саюзнікаў. «Не дай Бог, не падстрахуюць са спіны браты, прыйдзецца ваяваць самім», — адзначыў Прэзідэнт падчас візіту ў 103-ю гвардзейскую брыгаду. Якая ж сітуацыя «ў братоў» і як ідуць справы ў вайсковым супрацоўніцтве Беларусі з іншымі краінамі?

Фота БЕЛТА.

На жаль, АДКБ па-ранейшаму застаецца «цёмным конікам» і, як сказаў генеральны сакратар арганізацыі Мікалай Бардзюжа, «не падсвечана ў інфармацыйнай прасторы і нават у Расіі прэса больш піша пра НАТА чым пра АДКБ». Дарма журналісты не выказваюць цікавасці да гэтай арганізацыі, бо ўжо цяпер узаемадзеянне сілавікоў мае канкрэтныя вынікі, карысныя для кожнай з краін-удзельніц. Напрыклад, толькі ў межах праекта «Проксі» — супрацьдзеянне крыміналу ў інфармацыйнай прасторы — з 2009 года выяўлена і закрыта больш за 16 000 экстрэмісцкіх сайтаў, праваахоўнымі органамі заведзена каля 3600 крымінальных спраў. Што тычыцца будучыні структуры, то, на думку беларускага Прэзідэнта, «Еўразійскі эканамічны саюз чакае ваенная і палітычная інтэграцыя» са зменай ролі АДКБ да статусу «вайсковай арганізацыі» новага ўтварэння.

Пакуль у блок уваходзяць 6 краін: Расія, Беларусь, Казахстан, Арменія, Таджыкістан, Кыргызская Рэспубліка. У межах АДКБ створаны тры вайсковыя групоўкі (расійска-армянская, расійска-казахстанская і расійская-беларуская), існуюць калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання, куды ўключаны элітныя часткі Узброеных Сіл краін-удзельніц, спецыяльныя падраздзяленні МУС, антытэрарыстычныя групы, структуры наркакантролю і міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях.

Але падобна на тое, што перспектывай АДКБ сапраўды будзе роля абарончага парасона для ЕАЭС. 8 мая 2014 года ў Маскве адбылася закрытая сустрэча кіраўнікоў дзяржаваў АДКБ, былі праведзены паказальныя трэніроўкі, у тым ліку імітацыя ядзернага ўдару. Саюзнікам былі прадэманстраваныя магчымасці па забеспячэнні бяспекі на прасторах Арганізацыі. Такі ядзерны шчыт з'яўляецца найважнейшай гарантыяй суверэнітэту для саюзнікаў Расіі. Але бяспека саюзнікаў — жыццёва важны інтарэс самой Расійскай Федэрацыі, інвестыцыі ў абарончыя магчымасці партнёраў гарантуюць будучыню яе самой. Як слушна заўважыў генсек АДКБ Мікалай Бардзюжа, «бліжэй за пяць краін АДКБ у Расіі нікога няма». Калі казаць аб Беларусі, то знакаміты «беларускі балкон» і тыя самыя «800 кіламетраў да Масквы», што абараняе беларуская армія сёння, у рэчышчы падзей ва Украіне, набываюць зусім іншае гучанне нават у рыторыцы самых радыкальных расійскіх лібералаў.

Відаць, да разумення значнасці ролі Беларусі, як заходняга рубяжу АДКБ, прыходзіць і палітычнае кіраўніцтва Расіі: падчас выставы MILEX-2014 Міністэрства абароны РФ падпісала кантракт аб бязвыплатнай перадачы беларускаму боку чатырох зенітна-ракетных комплексаў С-300.

І тут вельмі важна разумець, што ўмацаванне Узброеных Сіл Беларусі — гэта не падстава для мілітарызму, але патрэба суверэннага развіцця і неабходная гарантыя мірнага жыцця цывільнага насельніцтва.

НАВІНЫ

ВЯДУЧЫЯ ВНУ ВЫЗНАЧЫЛІ КОШТ НАВУЧАННЯ

Установы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі самастойна і ў адпаведнасці з заканадаўствам вызначаюць кошт навучання на 2014–2015 навучальны год для студэнтаў 1-га курса і змяняюць кошт навучання для астатніх студэнтаў на падставе дагавораў аб падрыхтоўцы спецыяліста на платнай аснове, паведаміла БЕЛТА прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія Ваніна.

Да моманту падпісання дагавораў на навучанне ўсе навучальныя ўстановы павінны вызначыцца з цэнамі. Некаторыя з іх ужо назвалі кошт навучання. Так, для студэнтаў 1-га курса ў БДУІР навучанне будзе каштаваць ад Br20 млн за год на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак да крыху больш як Br6 млн за год на завочным аддзяленні. У БДЭУ цэны вар'іруюцца ад Br5 млн да Br17 млн у год. Студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце заплацяць за навучанне ад крыху больш як Br7 млн да Br18 млн за год. Улічваючы сацыяльную значнасць паслугі па падрыхтоўцы спецыяліста на платнай аснове, кіраўнікі ВНУ і ССНУ на падставе заяў грамадзян па магчымасці могуць спаганяць плату за навучанне з адтэрміноўкай або растэрміноўкай плацяжу. «Пры гэтым усе кіраўнікі нясуць персанальную адказнасць за неабгрунтаванае павышэнне кошту навучання», — адзначыла прэс-сакратар Мінадукацыі.

«АЙЧЫНА» І «БАЦЬКАЎШЧЫНА» Ў ПОШУКАХ

Пошукавы атрад грамадскага аб'яднання «Айчына» Рэспублікі Татарстан сумесна з беларускай пошукавай грамадскай арганізацыяй «Бацькаўшчына» ўжо некалькі тыдняў вядуць пошукі загінулых воінаў Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Зэльвенскага і Слонімскага раёнаў.

З Татарстана ў Беларусь прыехала каля 70 чалавек — у асноўным гэта студэнты вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, якія разам з беларусамі вядуць пошукі воінаў каля рэчкі Зальвянкі на Зэльвеншчыне, а таксама ў раёне Бяздоннага возера і ў вёсцы Клепачы на Слонімшчыне.

Акрамя гэтага, госці з Татарстана правялі Вахту памяці на мусульманскіх могілках у Слоніме. Яны не толькі памянулі загінулых воінаў-татар падчас Першай і Другой сусветных войнаў, але і дапамаглі слонімскім мусульманам падняць і ўстанавіць старыя помнікі на могілках. Па словах імама-старшыні аб'яднання мусульман Слонімшчыны Сулеймана Байрашэўскага, было ўстаноўлена каля 30 надмагільных помнікаў, сярод якіх адноўлены помнікі 1850, 1874, 1900 гадоў.

Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.

ФАКТЫ

КАНТРОЛЬ ЗА ДАЎГАБУДАМІ

Кантроль за ходам будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў з мінулымі нарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва Камітэт дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці ажыццяўляў штодзень па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

На пачатак года ў вобласці было 24 такія даўгабуды. Прычыны — неўкамплектаванасць членамі кааператываў і дольшчыкамі, незабеспячэнне ў поўным аб'ёме фінансаваннем згодна з графікам. Асаблівую трывогу ў спецыялістаў Камітэта дзяржкантролю выклікала будаўніцтва двух маналітных дамоў у Гомелі — у 21 і 94 мікрараёнах, дзе работы на пачатак 2014 года былі выкананы толькі на 22% і 11% адпаведна. Пры гэтым тэхналагічныя асаблівасці іх узвядзення не дазвалялі будаваць гэтыя дамы метадам «штурмаўшчыны». І ўсё ж агульнымі намаганнямі быў забяспечаны ўвод праблемных дамоў у першым паўгоддзі сёлета.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАБЛЕМНЫЯ ДАМЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ — У ЭКСПЛУАТАЦЫЮ

Аб гэтым паведамляе Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці па выніках аналітычных мерапрыемстваў у сферы жыллёвага будаўніцтва.

Падчас дзейнасці рабочай групы па праблемных пытаннях будаўнічай галіны ў пералік аб'ектаў, што ўзводзяцца са звышнарматыўнымі тэрмінамі, на Гродзеншчыне трапілі 40 шматкватэрных жылых дамоў. 31 з іх увялі ў эксплуатацыю летась, а здача 9 астатніх, згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, планавалася да 1 ліпеня гэтага года. Вобласць датэрмінова справілася з задачай: па стане на 16 чэрвеня ўведзены ў эксплуатацыю ўсе дамы, якія з'яўляліся праблемнымі. І, разам з тым, не дапусцілі ўтварэння новых звышнарматыўных аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва. Тым не менш работа па кантролі за выкананнем нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва жылля ў вобласці не спыніцца і будзе прадоўжана.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАДЗЕІ

ТАЯМНІЦЫ ЖЫВОГА АГНЮ

У Бабруйску стартаваў XII Міжнародны пленэр па керамікі «Арт-Жыжаль». З 10 па 31 ліпеня будуць варажыць над глінай майстры з 8 краін — Беларусі, Расіі, Украіны, Сербіі, Балгарыі, Латвіі і Турцыі.

У палявых умовах яны будуць ляпіць унікальныя па аб'ёмна-прасторавым і каляровым рашэнні дэкаратыўныя падлогавыя свяцільні «жывога агню». Але самай відовішчнай падзеяй стане стварэнне 2-метровай вогненнай скульптуры. Нарыхтоўку накрыюць цеплаізаляцыйным матэрыялам і будуць працаваць проста на топцы.

— Гэтага, акрамя нас, ніхто ў Беларусі не робіць, — падзяліўся **заснавальнік і ідэйны натхняльнік пленэру, старшыня Бабруйскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў Валерый КАЛТЫГІН.** — Сам працэс вельмі захапляльны. Падчас яго можна пабачыць унікальныя вогненныя спецэфекты.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ФАКТЫ

ДАРОСЛЫЯ КРАДУЦЬ У ДЗЯЦЕЙ

Міліцыя Міншчыны падвяла вынікі першага месяца аздараўленчай кампаніі. Як адзначылі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, у лагерах не зарэгістравана правапарушэнняў, у тым ліку і крадзяжоў асабістых рэчаў дзяцей і абслуговага персаналу.

Аднак ёсць выпадкі, калі несумленныя работнікі крадуць прадукты харчавання. У прыватнасці, у чэрвені міліцыянеры папярэдзілі 18 такіх фактаў. Напрыклад, у адным з лагераў Маладзечанскага раёна пяць работнікаў сталовай спрабавалі ўкрасці 16 напакаваных харчамі сумак. Але ім не далі гэтага зрабіць супрацоўнікі абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў і раённага ўпраўлення ўнутраных спраў. Як правіла, абкрадваюць выхаванцаў повары, паколькі маюць прамы доступ да кухні. У раскрадальнікаў адабрана шмат прадуктаў, прызначаных для дзяцей: мяса, крупы, агародніна, садавіна, цукеркі і шмат чаго іншага. У выніку зладжаных дзеянняў міліцыі ўдалося пазбегнуць страт на мільёны рублёў.

Праваахоўнікі паведамілі, што ў дачыненні да парушальнікаў заканадаўства прымаюцца жорсткія меры, вядзецца кантроль па захаванні бяспекі дзяцей, штодня арганізуюцца аператыўна-прафілактычныя мерапрыемствы. Ужо запратакаліравана сем фактаў, калі дарослыя распівалі спіртныя напоі на рабочым месцы. А ў лагеры «Гарызонт» Маладзечанскага раёна міліцыя папярэдзіла факт ужывання алкаголю. Разам з тым, злоўлены на месцы правапарушэння і двое непаўналетніх за курэнне і ўжыванне моцных напояў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

СТЫЛЬ МЫСЛЕННЯ СЯРГЕЯ КАЦЬЕРА

Асоба творцы на мяжы мастацтва і жыцця

На творчым рахунку гэтага тэлерэжысёра, сцэнарыста, журналіста не адна праграма, сярод якіх «Тэлевізійны дом кіно», «Час кіно», «Кінавёрсты», некалькі дзясяткаў тэлепартрэтаў вядомых дзеячаў кінамастацтва. Але ніводную са сваіх работ Сяргей Кацьер не лічыць вяршыняй творчасці, бо ён з'яўляецца самакрытычным і патрабавальным да сябе як да чалавека і да творцы. Сёлета яго дакументальны фільм «Залаты Віцязь. Мікалай Бурляеў» быў адзначаны Гран-пры на аднайменным міжнародным форуме. Каб пачуць яго ацэнку гэтай падзеі, а таксама абмеркаваць сучасны стан дакументальнага кіно, мы завіталі на сустрэчу з мэтрам.

ЗНАК ЯКАСЦІ

— Давайце вернемся да фестывалю «Залаты Віцязь». Якія ўражанні пакінуў ён на гэты раз?

— Уражанні засталіся самыя станоўчыя. На «Залатым Віцязі» я бываю вось ужо на працягу 20 гадоў. Памятаю свой першы прыезд на фестываль (яго тады праводзілі ў Цярэспалі). Там я пазнаёміўся з Мікалаем Бурляевым і іншымі ўдзельнікамі, якія за гэтыя гады сталі маімі сябрамі. Фестываль мне вельмі блізкі, таму што яго дэвіз «За духоўныя ідэалы, за ўзвышэнне душы чалавека» я лічу, у прынцыпе, асновай дзяржаўнай палітыкі, пра якую ў нас так шмат гавораць. «Залаты Віцязь» займаецца гэтым вось ужо на працягу двух дзясяткаў гадоў. І столькі ж я разам з ім рабіў рэпартажы, праграмы, творчыя партрэты, якія потым і ўзнагароды заваёўвалі. Летась, калі кіраўніцтва канала «Беларусь 3» прапанавала мне зрабіць фільм пра заснавальніка фестывалю, з задавальненнем узяўся за працу.

Мікалай Бурляеў для мяне перш за ўсё аўтарытэт у галіне кіно. Чалавек, які ўдзельнічаў у стварэнні такіх фільмаў, якія маюць вагу ў сусветным кінематографе. Таксама ён па сваёй грамадскай дзейнасці з'яўляецца адным з адметных дзеячаў славянскай культуры. Мне, напрыклад, удалося пазнаёміцца з яго трохтомнікам, што выйшаў летась. І, ведаеце, я быў уражаны: настолькі гэты чалавек — цэльная натура. Я, мабыць, упершыню сустрэў акцёра, у якога няма зазору паміж ім на экране і чалавекам у рэальным жыцці. У яго так пабудавана жыццё ў творчым і чалавечым планах, што не адчуваеш і не бачыш размежаванасці. Гэта было для мяне самым прыемным у працы над фільмам. Там не проста гісторыя «Залатога Віцязя», а гісторыя пра чалавека, якога я паважаю, якім захапляюся, які блізкі мне па духу.

Я казаў тое са сцэны і цяпер паўтарусь, што гэтая ўзнагарода не мне як рэжысёру, а прыз Мікалаю Пятровічу як з'яве ў мастацтве і ў жыцці. Лічу, узнагародзілі і Беларусь, бо на працягу ўсяго існавання фестывалю наша краіна заўсёды падтрымлівала яго. Таксама гэта прыз Белтэлерадыёкампаніі, якая заўжды знаходзіць магчымасць паслаць здымачную групу на «Залаты Віцязь» і тым самым не абмінуць падзеі кінафоруму. Таксама ўзнагародзілі наш культурны тэлеканал «Беларусь 3», які выступіў ініцыятарам стварэння гэтага фільма. Я атрымаў узнагароду, аднак гэта наша агульная перамога.

— Калі гаварыць пра кіно на сёлетнім фестывалі: ці ўдалося ўбачыць свежы погляд, нешта асаблівае?

— Сёлета я быў членам журы ў намінацыі «Дакументальнае кароткаметражнае кіно», дзе было шмат фільмаў з розных краін, таму паглядзець нешта ў іншых намінацыях не заўсёды ўдавалася. Беларусь, як заўсёды, была годна прадстаўлена на фестывалі. Нават, калі гаварыць пра нашу намінацыю, то фільм Юрыя Цімафеева «Крокі над вадой» атрымаў «Залатога Віцязя». Юрый — выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, таленавіты малады чалавек, які цяпер працуе на «Беларусьфільме». Было вельмі прыемна, калі журы сышлося ў меркаванні, што гэты фільм лепшы. Ён выбіваўся з асноўнага конкурснага патоку сваёй мастацкасцю, наяўнасцю аўтарскага погляду.

Рэжысёр — гэта стыль мыслення, светапогляд, уменне арганізаваць працэс. Таму я наогул не камплексую з-за таго, што нехта з маіх вучняў не будзе займацца тэлебачаннем.

Сёння настолькі ўсе прывыклі да тэлевізійнага фармату, да мэйнстрыму ў дакументальным кіно, калі трэба ўсё рабіць хутка, дынамічна, а тут зусім іншае кіно — паглыбленне ў героя, выразныя сродкі, вобразнасць. Хаця ў нашай намінацыі былі і іншыя добрыя карціны. Спрабую на «Лістапад» прапанаваць фільм «Папа, здравствуй» рэжысёра Наталлі Кананенкі, у аснове якога ляжыць прытча пра блуднага сына, але гэта дакументальнае кіно. Дэбют ад жанчыны-рэжысёра. На фестывалі карціну ўзнагародзілі «Бронзавым Віцязем». Галіна Адамовіч прадставіла выдатную працу. Яе фільм «Шамбала» пра людзей на беларускіх балотах — таксама вельмі пранікнёны. І такіх фільмаў было шмат, але, на жаль, добрых работ на фестывалі заўсёды больш, чым прызоў.

Мне даводзіцца быць на розных фестывалях, і заўсёды я чую меркаванні, што беларускае кіно — гэта перш за ўсё якасць. Прыемна, што з часам наш узровень не падае.

КОЖНЫ САМ ВЫБІРАЕ ДАРОГУ

— Вы выкладаеце ў Акадэміі мастацтваў не першы год. Што можаце сказаць пра патэнцыял маладых талентаў?

— Хачу сказаць, што моладзь у нас выдатная. Усе, хто прыходзіць да нас у акадэмію вучыцца, розныя. Часам даводзіцца і сварыцца, бо кажу ім , што нельга быць такімі лянівымі і нецікаўнымі. Ёсць праблемы з выбарам тэм, з іх асэнсаваннем. Добра, калі на рэжысуру прыходзяць, ужо маючы адукацыю за плячыма. Тады ў чалавека ўжо сфарміравана пэўнае бачанне свету. Напрыклад, быў у мяне курс, дзе студэнты атрымлівалі ўжо другую вышэйшую адукацыю. І мне было прыемна з імі працаваць. Цяпер усе яны ў прафесіі, гэта вельмі радуе.

Кожны сам выбірае дарогу. Рэжысура — вельмі шырокае паняцце. Неабавязкова працаваць на тэлебачанні, калі ты скончыў акадэмію па спецыяльнасці «Рэжысура тэлевізійнага кіно». Рэжысёр — гэта стыль мыслення, светапогляд, уменне арганізаваць працэс. Таму я наогул не камплексую з-за таго, што нехта з маіх вучняў не будзе займацца тэлебачаннем.

Усе знойдуць сваё месца. Нават проста атрымаць вышэйшую гуманітарную адукацыю карысна. Бо тут гісторыя кіно, літаратуры, жывапісу і наогул мастацтва. Гэта спатрэбіцца ў жыцці, каб элементарна сваім дзецям патлумачыць, што добра і што дрэнна. У мяне на курсе шмат дзяўчат вучыцца, і я не ўпэўнены, што ўсе яны стануць рэжысёрамі тэлебачання. Праца складаная, я, можа, нават і не жадаў бы іх бачыць на тэлебачанні, таму што яно патрабуе самаахвяравання. Гэта машына, канвеер. А жанчына павінна мець час выхоўваць дзяцей, гатаваць мужу смачныя абеды, павінна быць падтрымкай у сям'і. Калі ж яна прападае на тэлебачанні днямі і начамі, то гэта не жанчына, а рэжысёр. Але я не асуджаю іх за жаданне вучыцца.

Прафесіяналамі становяцца ў працы. Вучоба ва ўніверсітэце — толькі фундамент, ад якога пры жаданні ты потым зможаш адштурхнуцца, а можаш пайсці зусім іншым шляхам. Сённяшнія студэнты знаходзяцца далёка наперадзе ў плане тэхналогій. Іншая справа, што ўсе хочуць здымаць, арыентуючыся на ўласныя пажаданні, а на тэлебачанні сёння правілы дыктуе прадзюсар і густы гледачоў. Тэндэнцыя дрэнная, але тэлебачанне — з'ява масавая і даступная ў кожным доме: а кіно — яно павінна быць аўтарскім, эксклюзіўным і не рыначным. Нельга ўсё вымяраць рублём.

— Які ваш падыход у навучанні? Як дапамагаеце маладым людзям шукаць сябе ў прафесіі?

15.40 Раманавы. Царская справа. «Апошні імператар. Рускі ўрок».
16.40 «Факты».
17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».
21.00 Маст. фільм «Як развесці мільянера».
0.30 «Жывы гук».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.10 «Выратавальнікі».
8.35 «Да суда».
9.30, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара» (працяг).
11.50 «Суд прысяжных».
13.20 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 «Пракурорская праверка».
15.15 «Справа густу».
15.40, 18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.35, 23.20 Серыял «Глухар. Працяг».
20.00 Серыял «Адысея сышчыка Гурава».

8 КАНАЛ

7.00, 12.30, 19.00, 20.55, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.05 Мультпарад.
7.30 Баявік «І цэлага свету мала».
18.45 «Тэлемагазін».
19.05 Серыял «Страла».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Ацалелы».
23.10 Серыял «Да смерці прыгожая».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.10, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
10.00 «Практычная магія».
11.00 Серыял «Свацця».
12.00 Серыял «Паласатае шчасце».
13.00, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «ГАЛЫГІН. RU».
16.00 Фэнтэзі «Чортаў мабільнік».
18.30, 0.30 «Лаві момант».
19.00 «Нерэальная гісторыя».
20.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
21.10 Камедыя «Фартуна Вегас».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.00 Навіны культуры.
9.20 Шэдэўры старога кіно. «Дон Дыега і Пелагея». Маст. фільм.
10.20 «Марыя Блюменталь-Тамарына. Улюбёнка Масквы». Дак. фільм.
11.05 «Сцяг і аркестр, напярад!..» Дак. фільм.
11.30 «Красуйся, горад Пятроў!» Паўлаўскі парк.
12.00 «Як уладкаваны Сусвет». Дак. серыял, заключная серыя.
12.45 «Госць». Маст. фільм.
14.10 Тэатральны фестываль тэлеканала «Культура». МХТ ім. А.П. Чэхава. Канстанцін Хабенскі, Алена Панова, Міхаіл Парэчанкаў у спектаклі «Качынае паляванне».
17.05 Валерый Гергіеў і Сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра.
17.40 «Сусветныя скарбы культуры».
18.15 «Шляхі Сергія Раданежскага». Дак. фільм.
18.40 Святкаванне 700-годдзя Прападобнага Сергія Раданежскага.
19.45 «Два Фёдары». Маст. фільм.
21.10 «Шукальнікі». «Тайны Дома Фабержэ».
22.20 Вялікі джаз.
0.55 «Жывая прырода Францыі». Дак. серыял. 1-я серыя.
1.50 «О. Генры». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 Дак. фільм «Кітай. Страчаныя перамогі».
5.50 «Маленькі канцэрт». 1985 год.
6.05 М/ф «Павучок Анансі і чарадзейная палачка». 1973 год.
6.30, 12.25 Маст. фільм «Бедная Маша».
7.40 Дак. фільм «Наш адпачынак».
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Пяць плюс». Дабрачынная тэлегульня-латарэя. 1991 год.
11.00 «Марафон-15». 1993 год.
11.55 «Ранішняя пошта». 1985 год.
13.40 Канцэрт замежнай эстрады.
16.00 Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Дыяментавыя вяселлі». 1992 год.
17.00 «Капітан з «Дабрадатнай». 1993 год.
17.55 «Музычныя гарошыны». 1991 год.
18.25 Тэлефільм «Следства вядуць Знатакі».
21.00 «Кінапанарама» «Міжнародны кінафестываль у Рыміні». 1-я частка. 1990 год.
22.00 «Кінапанарама» «Міжнародны кінафестываль у Рыміні». 1-я частка. 1990 год.
23.00 «Камера глядзіць у свет». 1986 год.
23.45 Фільм-канцэрт «Я жадаю вам шчасця...». 1973 год.
0.30 Тэлеспектакль «Беспасажніца». 2-я серыя. 1974 год.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ
11 ліпеня 2014 г. ЗВЯЗДА — 5

1.25 «Музычны кіёск». Іосіф Кабзон. 1988 год.

EUROSPORT

9.35, 13.15, 15.15, 0.00 Веласпорт. Тур дэ Франс.
10.30, 15.00, 18.30, 1.00 Веласпорт.
10.45 Лёгкая атлетыка. ЕАА.
12.15 WATTS.
18.45, 1.15 Фехтаванне. Чэмпіянат свету.
20.30 Наймацнейшыя людзі планеты.
21.30 Бокс. J. Makabu (Конга) — J. Gomez (Куба).
23.30 Ралі. ERC.

КАМЕДЫЯ

5.00, 9.00, 13.30, 16.30, 21.00, 2.10 Серыял «Бет!».
5.45 Меладрама «Любоўныя раны».
7.25 Камедыя «Вяртанне высокага бландзіна».
8.45, 13.15, 19.00, 1.55 Скетчком «Паміж намі».
9.45 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
11.20 Камедыя «Лячэнне».
11.45 Камедыя «Трэзор».
14.20 Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана!».
15.55 Камедыя «Праца».
17.20 Камедыя «Дзяўчына з карабля».
19.20 Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
22.10 Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
23.40 Камедыя «Чэмпіён».
0.15 Камедыя «Дыска».
3.00 Меладрама «Чаго чакаць, калі чакаеш дзіця».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.30, 14.30 «Доктар І..».
8.55, 18.30, 2.45 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
10.30, 4.20 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
12.15, 17.30 «Справа Астахова». Дак. серыял.
19.30 «Нерэальная гісторыя».
20.00 Камедыя «Дублёр».
21.45 Камедыя «Горка!».
23.50 Меладрама «Гувернантка».
1.50 Драма «Забава».
4.00 Меладрама «Ён, яна і я».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
6.00, 19.00, 22.00 Навуковыя недарэчнасці.
7.00, 12.00 Зрабі або памры.
8.00, 13.00 Дзікі тунец.
9.00, 14.00 Экстрэмальнае падарожжа.
10.00 Машыны: разабраць і прадаць.
11.00, 18.00 Золата Юкана.
15.00 Апошні тыгр Суматры.
16.00 Дзікая прырода Амерыкі.
17.00, 2.00 Дагістарычныя монстры Гітлера.
20.00, 0.00, 3.00 Эвакуацыя Зямлі.
21.00, 1.00, 4.00 Паранармальнае.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

DISCOVERY

7.00 Залатая ліхаманка.
7.50 Джэсі Джэймс: гараж з нуля.
8.40, 13.15 Як гэта ўстроена?
9.10, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Майстры выжывання.
10.30, 5.10 Не спрабуйце паўтарыць.
11.25 Ліквідатар.
12.20, 0.55 Top Gear.
13.40, 3.55 Што ў вас у гаражы?
14.35, 6.05 Вялікі махінатар.
15.30 Горад навыварат.
22.00 Выратавальны яд.
23.00 Цуды Сонечнай сістэмы.
0.00, 3.05 Каралі аўкцыёнаў.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 19 ЛІПЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.20 Існасць.
7.45 Меладрама «Белае сукенка».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.45, 23.20 Серыял «Сваты 5».
10.55 «Пра ежу!».
11.30 Дача.
12.10 Давярай і правярай.
12.50 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
13.30 Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Выпрабаванне». «Крыжовы шлях».
14.10 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёну.
15.30, 0.35 «Вялікая розніца».
16.40 «Славянскі базар у Віцебску-2014». Алег Газманаў.
19.00 Меладрама «Дзякуй за каханне».
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Вікі Крысціна Барселона».
0.25 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.20 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
8.35 Фільм-казка «Падменная каралева».
9.45 Беларуская кухня.
10.25, 21.05 Тэлебарометр.
10.30, 21.40 Серыял «Інтэрны».
12.30 «Два з паловай кухары».
13.05 Вышэй за дах.
13.40 Драма «Фінішная прамая».
15.35 Баявік «Апошні кінагерой».
18.00 «Comedy woman».
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.05 «Суперінтуіцыя. Каханне».
21.00 КЕНО.
21.10 Рэальны свет.
23.40 Камедыя «Ты з якой планеты?»

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.05, 21.00, 23.35 «Калейдаскоп».
8.10 «Заўтра — гэта мы!».
8.35, 17.15 «Размаўляем па-беларуску».
8.40 Серыял «Мегрэ».
13.15 «Наперад у мінулае».
13.45 VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета. Канцэрт да 25-годдзя Камернага аркестра гімназіі-каледжа пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Перліна.
15.05 «АРТіШОК». Мастачка Марына Капілава.
15.30 «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава». Маст. фільм.
16.50 «Бесценных слов транжир и мот». Уладзімір Маякоўскі. Дак. фільм.
17.20 «Тры талеры». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.10 Сусветнае кіно. «Каханне, што збівае з ног».
22.40 «Калі змоўкла сегідылля». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.05 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Расія — Італія.
9.35 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Вялікабрытанія — Нідэрланды.
11.10 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Францыя — Іспанія.
12.40, 15.25 Тэніс. Уімблдон.
13.55 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Грузія — Расія.
16.55 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Харватыя — Сербія.
18.35 Пляжны футбол. Еўраліга. 3-і этап. Беларусь — Грэцыя.
19.55 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Італія — Чарнагорыя.
21.30 Еўрапейскі покерны тур.
22.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Партугалія — Гана.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «ТБ-таксі».
12.30 «Аляксандр Шырвінт. Галоўная роля».
13.30 Кіно ў колеры. Меладрама «Тры таполі на Плюшчысе».
15.00 «Імгненні. Таццяна Лісёзнава».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
18.05 Маст. фільм «Вострараў».
21.05 «Сёння вечарам».
22.45 Баявік «Драпежнік».
0.45 Драма «Прыгажунчык Джоні».

СТБ

6.30 Серыял «Турысты».
8.00 «Анфас».
8.15 Камедыя «Агент па мянушцы Спот».
10.00 «Чыстая праца».
11.00 «Рэпарцёрскія гісторыі».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.40 Маст. фільм «Дванаццатая ноч».
15.20 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.35 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Дзяўчына, якая гуляла з агнём».
22.30 «Зорны рынг».
23.30 Камедыя «Хлапечнік у Вегасе».

МІР

5.00 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 «Ой, мамачкі».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны (бягучы радок).
9.10 «Любімыя акцёры».
9.35, 1.05 Маст. фільм «Не гаруй!».
11.10 Серыял «Таццяна».
15.10 Серыял «Кантора».
20.05 Маст. фільм «Вадаспад анёла».
21.50 Маст. фільм «Ствараючы вобраз ахвяры».
23.30 Маст. фільм «Вярнуць Веру».
2.40 Маст. фільм «Замах».
4.30 Дак. фільм «Дзённік назіранняў».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Любачка».
8.30 Маст. фільм «Я падару сабе цуд».
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.10 «Мая «жалезная лэдзі». Таццяна Ліёзнава».
12.10 М/ф.
12.20 Серыял «Мора па кавалена».
14.15 «Язь. Перазагрузка».
14.45 «Пра дэкор».
15.35 «Правілы жыцця 100-гадовага чалавека».
16.30 «Смяцца дазваляецца».
18.10 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
21.00 Маст. фільм «Надзея».
0.25 1/4 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Урачэбныя тайны +».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
14.15 «Следства вялі...».
15.05, 16.20 Серыял «Двое з пісталетамі».
19.35 «Самыя гучныя рускія сенсацыі».
21.20 «Ты не паверыш!».
22.10 Серыял «Грамадзянка начальніца. Працяг».
23.50 Камедыя «Не нарадзіся прыгожым».

8 КАНАЛ

9.00, 11.55, 18.55, 21.00, 23.35 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.25 Серыял «Страла».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Серыял «Да смерці прыгожая».
12.00 Баявік «Марскі пехацінец».
13.35 Драма «Ахоўнік для дачкі».
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Маст. фільм «Кандагарскі прарыў».
18.10 Серыял «Паліцыя Гаваяў».
19.00 Трылер «Белая імгла».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Камедыя «Рэцэпт кахання: без цукру».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00 «Міксер».
12.00 «Спытайце кухара».
13.00 Серыял «Аманда О».
15.00 Камедыя «Фартуна Вегас».
17.00, 0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».
20.30 Трылер «Ідэальныя ўцёкі».
22.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.30 «Лаві момант».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Шляхі Сергія Раданежскага». Дак. фільм.
9.35 «Два Фёдары». Маст. фільм.
11.00 «Махмуд Эсамбаеў. Чарадзей танца».
11.30 Вялікая сям'я. Наталля Крачкоўская.
12.25 Пернікавы домік. «Ажурны чыгун».
12.50 «Бязважкае жыццё». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
13.20, 0.55 «Жывая прырода Францыі». Дак. серыял. 1-я серыя.
14.15 «Вогненныя струны». Канадскае музычнае шоу ў Цэнтральнай канцэртнай зале Кітчэнера.
15.35 «Куруп — страчаная душа вернецца». Дак. фільм.
16.25 «Кінагерой. Стагоддзе рускай містыфікацыі». Дак. фільм.
17.20 «Рамантыка раманса». «Сэрца, табе не хочацца спакою...».
18.15 «80 гадоў Аляксандру Шырвінту. «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». Маст. фільм.
20.25 «Астравы». Аляксандр Шырвінт.
21.05 «Добры, дрэнны, злы». Маст. фільм.
23.55 «Джаз на сямі вятрах».
0.35 «О мора, мора!..» «Ліфт». М/ф для дарослых.
1.50 «Джэк Лондан». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Марафон-15». 1993 год.
5.55 «Ранішняя пошта». 1985 год.
6.25, 0.30 Маст. фільм «Бедная Маша».
7.40 Канцэрт замежнай эстрады.
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Дыяментавыя вяселлі». 1992 год.
11.00 «Капітан з «Дабрадатнай». 1993 год.
11.55 «Музычныя гарошыны». 1991 год.
12.25 Тэлефільм «Следства вядуць Знатакі».
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама» «Міжнародны кінафестываль у Рыміні». 1990 год.
17.00 «Пад знакам задыяка. Рак». 1992 год.
18.30 Капітал-шоу «Поле цудаў». 1993 год.
19.20 «Аўтограф па суботах. Закуліссе Веры Алентавай». 1993 год.
20.00 «Спяем, сябры». 1991 год.
21.00 Маст. фільм «Ювелірная справа».
22.30 Канцэрт замежнай эстрады.
23.00 Дак. фільм «Кітай. Страчаныя перамогі».
23.50 «Маленькі канцэрт». 1985 год.
0.05 М/ф «Павучок Анансі і чарадзейная палачка». 1973 год.
1.40 Дак. фільм «Наш адпачынак».
4.00 «Пяць плюс». Дабрачынная тэлегульня-латарэя. 2-я частка. 1991 год.

EUROSPORT

9.30, 12.00, 13.00, 23.45 Веласпорт. Тур дэ Франс.
10.30, 12.45, 18.30, 1.15 Веласпорт.
10.45 Фехтаванне. Чэмпіянат свету.
18.45, 21.00, 1.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-19).
23.15 Ралі. ERC.

КАМЕДЫЯ

5.00, 13.30, 21.00 Камедыя «Вечар у тэатры».
5.25, 13.50, 21.25 Камедыя «У парку».
5.40, 14.10, 21.40 Камедыя «Жорсткае, жорсткае каханне».
5.50 Камедыя «Вяртанне высокага бландзіна».
7.10, 19.00, 21.50, 1.50, 4.40 Скетчком «Паміж намі».
7.25 Камедыя «Трэзор».
9.00, 16.30, 2.10 Камедыя «Валацуга».
9.25, 17.00, 2.40 Камедыя «Паміж двума ліўнямі».
9.35, 17.10, 2.50 Камедыя «Дзіцячыя аўтамабільныя гонкі».
9.45 Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана!».
11.20 Камедыя «У гадзіну ночы».
11.45 Камедыя «Дзяўчына з карабля».
14.20 Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
15.55 Камедыя «Чэмпіён».
17.20 Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
19.20 Камедыя «Молі і мопс».
22.10 Меладрама «Дзяўчына майго лепшага сябра».
23.45 Камедыя «Банк».
0.15 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
3.00 Камедыя «Ужо хто б гаварыў 3».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.00, 4.45 «Залатая цешча». Серыял.
11.00 «Сардэчна запрашаем дадому!».
11.50 «Гісторыі выратавання».
12.20, 4.05 «Папялушкі савецкага кіно». Дак. фільм.
13.10, 2.40 «Агарова, 6». Маст. фільм.
14.50, 23.10 «Міністэрства аховы здароўя папярэджвае». Дак. фільм.
16.20 «Усе сабакі трапляюць у рай 2». М/ф.
17.40, 1.20 «Траекторыя лёсу». Дак. фільм.
19.10 «Граф Мантэнегра». Маст. фільм.
21.15 «Удалечыні ад рая». Маст. фільм.
0.35 «Белы каўнерык». Серыял.

ТБ1000

5.00, 15.00 М/ф «Дом-монстар».
7.00 Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
9.05 Драма «Дрэва».
11.05, 0.55 Драма «Гладыятар».
13.05 Камедыя «Ужо хто б гаварыў 3».
16.50 Камедыя «Мой хлопец — псіх».
19.05 Трылер «Недатыкальныя».
21.00 Драма «Небяспечны метад».
22.50 Камедыя «Піпец».
2.55 Драма «Дзяўчына ў парку».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
6.00 Золата горада-прывіда.
8.00 Космас: Прастора і час.
9.00 Навука будучыні Стывена Хокінга.
10.00 Займальная навука.
11.00 Паветраныя асы вайны.
12.00 Неразгаданыя тайны «Лузітаніі».
13.00 Хто пацапіў «Бісмарк».
14.00 Напад каётаў.
15.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
16.00 Экстрэмальнае падарожжа.
17.00 Разбагацей або памры на капальні.
18.00 Бітва калекцыянераў.
19.00 Навуковыя недарэчнасці.
21.00, 1.00 Свет таўстуноў.
22.00, 4.00 Неверагодна маленькі свет.
23.00, 2.00 Царква змеяносцаў.
0.00 У свеце амішаў.
3.00 Амішы: па-за законам.

DISCOVERY

7.00 Як гэта ўстроена?
7.25, 14.35 Новае жыццё рэтра-аўтамабіляў.
8.15 Голыя і напалоханыя.
9.10, 2.40 Рыбацкія легенды.
10.05 Смяротны ўлоў.
11.00, 6.05 Ліквідатар.
11.50 Паляўнічыя на склады.
12.45, 5.10 Майстры патаргавацца.
13.40 Паляўнічыя на аўтамабілі.
15.30 Аўтападполле.
16.25 Атам.
19.10 Усё і нічога.
21.00 Самагоншчыкі.
22.00 Наезнікі пекла.
23.00 Мафія амішаў.
0.00 Выратавальны яд.
0.55 Горад навыварат.
1.50 Цуды Сонечнай сістэмы.
3.30 Забойства ў Сараеве.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
4.45 Як гэта зроблена?

НЯДЗЕЛЯ, 20 ЛІПЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.35 Меладрама «Тры таполі на Плюшчысе».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.00 Серыял «Сваты 5».
10.50 «Пра ежу!».
11.25 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
13.10 Каробка перадач.
13.50 Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Выпрабаванне». «План» Ост».
14.25 Дыялогі аб цывілізацыі.
15.15 Твой горад.
15.30 «Зорная жыццё». «Як пражыць здраду».
16.40 «Славянскі базар у Віцебску-2014». Барыс Маісееў.
19.00 Меладрама «Белая сукенка».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Меладрама «Другое жыццё жанчыны».
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
21.10 Рэальны свет.
23.35 Камедыя «Апошні кінагерой».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.40, 21.05, 23.50 «Калейдаскоп».
8.10 «Таямніца душы».
8.35, 18.10 «Размаўляем па-беларуску».
8.40 Серыял «Мегрэ».
13.50 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
14.45 «Тры талеры». Маст. фільм.
18.15 «Аўтограф». Цыркавая студыя «Белая Русь» Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў.
18.45, 22.10 «Культпрасвет».
19.15 Сусветнае кіно. «Бесклапотны яздок».
20.45 Калыханка.
21.15 «Александрына збірае сяброў». Канцэрт «Грай, гармонік».
22.35 К.Крапіва. «Брама неўміручасці». Тэлеспектакль паводле аднайменнай фантастычнай камедыі.

БЕЛАРУСЬ 5

7.10 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Харватыя — Сербія.
8.40 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. ФК «Слуцк» — БАТЭ (Барысаў).
10.30 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Грузія — Расія.
12.05 Футбол. Чэмпіянат свету. ЗША — Германія.
13.55 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Расія — Францыя.
15.25 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Нідэрланды — Грэцыя.
16.55 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Італія — Іспанія.
18.25 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Брэст).
20.25 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Шахцёр» (Салігорск).
22.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Алжыр — Расія.
0.15 Футбол. Чэмпіянат свету. Паўднёвая Карэя — Бельгія.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «

■ На ўласныя вочы

ВАНДРОЎКА Ў ЭТНАКАЗКУ

Дзе сёння можна падарожнічаць у «кампаніі» з казачнымі гномамі? І якія маршруты прапануе турыстам легендарны Бялун? Польскія і беларускія журналісты накіраваліся ў прэс-тур па Сувальшчыне і Гродзеншчыне, каб даведацца аб цікавінках праекта «Вандроўка ў этнаказку».

Майстар-клас у Лідскім раённым цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры.

Даведка «Звязды»

«Вандроўка ў этнаказку» — праект міжнароднай дапамогі «Павышэнне прыцягальнасці трансгранічнага рэгіёна шляхам уключэння этнакультурных рэсурсаў у турыстычную дзейнасць» па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва Польшча—Беларусь—Украіна на 2007-2013 гг. Партнёрамі праекта, бюджэт якога складае больш за 1 мільёна еўра, з'яўляюцца Сувалкская аграгурыстычная палата, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей і гімназія №1 імя Я. Карскага ў Гродне.

СУВАЛЬШЧЫНА: КАЗАЧНЫ ШЛЯХ

Сувальшчына — не самы развіты эканамічна рэгіён Польшчы. Тут няшмат буйных прадпрыемстваў, і стаўку робяць найперш на турызм. Штогод, паводле інфармацыі **дырэктара Сувалкскай аграгурыстычнай палаты Эльжбеты НЯДЗЕЙКА,** сустракаюць каля 300 тысяч гасцей, да паслуг якіх вялікая колькасць аграсядзіб, атэляў, кавярняў і іншых аб'ектаў сэрвісу. «Раскрутку» сваіх прыродных і гісторыка-культурных славутасцяў праводзяць дзякуючы фінансаванню па шэрагу еўрапейскіх праграм, а таксама сучасных турыстычных тэхналогіях.

Напрыклад, «другое жыццё» атрымала створаная каля 100 гадоў таму Вігерская вузкакалейная чыгунка. Яна ўжо не мае гаспадарчага значэння, але затое служыць тысячам аматараў экалагічнага, краязнаўчага адпачынку, якія з задавальненнем вандруюць па Вігерскім нацыянальным парку ў спецыяльных вагончыках — з прыпынкамі ў найпрыгажэйшых мясцінах. Можа, гэтым вопытам скарыстаемся і мы? Вузкакалейкі ёсць і, напэўна, іх можна задзейнічаць не толькі для перавозкі торфу.

Альбо такая «фішка» — картка члена інтэрнэт-клуба шукальнікаў прыгод на Сувальшчыне. Прапануецца інтэрнэт-гульня, заснаваная на карце, гісторыі гэтага рэгіёна. Дайшоў, дапусцім, да пятага ўзроўню, а далей, каб пашырыць свае веды пра Сувальшчыну, павінен туды прыехаць.

А вось як папулярызуецца сямейны адпачынак. Турыстам выдаецца прывітальны пакет з даведнікам аб цікавых аб'ектах рэгіёна і пашпарт вандроўніка, дзе ўказаны гэтыя месцы. Усюды па маршруце вандроўкі ёсць пункт, дзе ў пашпарце прастаўляецца пячатка — арыгінальная для кожнага аб'екта. Пры гэтым спецыяльна для дзяцей пазначаны мясціны, наведванне якіх спалучаецца з нейкімі забавамі, загадкамі. Пабываў там — на памяць узнагарода, звязаная з гісторыяй краю. Для самых маленькіх вандроўнікаў гэта прыгожы дамок з постацямі герояў аповесці ўраджэнкі Сувалак, пісьменніцы Марыі Канапніцкай «Пра гномаў і сіротку Марысю», для старэйшых — кніга яе казак. Як удзячнасць госцю за знаёмства з рэгіёнам і, разам з тым, знак павагі да сваёй знакамітай зямлячкі.

Дарэчы, менавіта творы Марыі Канапніцкай сталі «падмуркам» польскай часткі праекта «Вандроўка ў этнаказку». Яна так і называецца — «Казачны шлях», які аб'ядноўвае 7 вёсак у ваколіцах Сувалак. У кожнай — свая тэма паводле творчасці Марыі Канапніцкай і мясцовых паданняў. Дзецям прапануюць у гульнявой форме азнаёміцца з гісторыяй продкаў мясцовых жыхароў — яцвягаў, элементамі іх побыту, з дарамі навакольных лясоў і тутэйшымі прадстаўнікамі жывёльнага свету, а таксама быццам самім прайсці ўслед за казачнымі персанажамі. Самыя паважаныя сярод іх — добрыя гномы, якіх, калі зацікавішся, абавязкова сустрэнеш на сваім «казачным шляху». Але можна ўбачыць і... пацука. Менавіта ён, паводле казкі Марыі Канапніцкай пра хлопчыка Петрыка, краў у сялян збожжа. І, прайшоўшы казачным маршрутам, гэтага злодзея можна ўбачыць. Толькі і розніца з уражаннямі Петрыка, што не трэба пужацца, бо пацук... драўляны.

Для дзяцей, якія вандруюць па маршрутах «Казачнага шляху» на Сувальшчыне, падрыхтаваны анімацыйныя праграмы і падарункі (напрыклад, шапка гнома). А побач ствараюцца і ўмовы для адпачынку дарослых — аграсядзібы і палатачныя пляцоўкі, байдаркі для сплаваў па тутэйшых вадаёмах і тэнісныя корты...

Справа за галоўным — наладзіць супрацоўніцтва паміж беларускімі і польскімі турфірмамі, прадумаць найбольш спрыяльныя варыянты вырашэння візавых пытанняў.

ГРОДЗЕНШЧЫНА: ГАСЦІНЦАМІ БЕЛУНА

Такую назва атрымала беларуская частка праекта «Вандроўка ў этнаказку». Бялун ва ўсходнеславянскай міфалогіі — гэта бог удачы, багацця і шчасця, які лічыцца апекуном вандроўнікаў. Так бы мовіць, «Без Белуна, што ў цёмным лесе...».

— У Беларусі шмат магчымасцяў прапанаваць турыстам розныя «куткі» гісторыі, культуры і прыроды. У рамках «Вандроўкі ў этнаказку» мы, фарміруючы новыя турыстычныя маршруты, і для сябе выцягнулі нашу краіну, — кажа **кіраўнік праекта, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны ГрДУ імя Я. Купалы Віталь КАРНЯЛЮК.**

Праект дапамог універсітэту арганізаваць вучэбны цэнтр этнічнага турызму, які скіраваны на навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў. Стварылі сайт этнатурыстычных рэсурсаў Гродзеншчыны і Сувальшчыны (www.ethno-tour.grsu.by), дзе ёсць карта з аб'ектамі этнічнага турызму, а таксама звесткі аб фальклорных калектывах і ўмельцах, якія працуюць у самых розных кірунках народнай творчасці, — ганчарах, цеслярах, кавалях, майстрах бондарства, саломапляцення, ткацтва, выцінанкі і пісанкі ...

А прачытаўшы пра рамеснікаў, можна не толькі ўбачыць іх за працай, але і самому павучыцца прасці, ткаць, вязаць, вышываць, рабіць валёнкі, пісанкі...

Адзін з аб'ектаў маршруту «Гасцінцамі Белуна» — гродзенская гімназія № 1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага. Тут знаходзіцца адзіны на постсавецкай прасторы музей, які прысвечаны знакамітаму філолагу, мовазнаўцу, аўтару кнігі «Беларусы». А цяпер яшчэ за сродкі праекта створана інфармацыйна-выставачная зала. Такім чынам, маем аб'ект, які варты ўвагі не проста ў фармаце школы, але і павінен адчыніць дзверы для масавага турызму.

Новыя магчымасці для турызму з'яўляюцца і ў Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея на Мастоўшчыне. Журналісты там не толькі азнаёміліся з экспазіцыяй, але і атрымалі майстар-клас па ткацтве, а таксама сертыфікат аб паспяховай здачы іспытаў па вясковым побыце, кавальскай справе, пляценні вянкоў, гісторыі Гудзевічаў, спрыце і іншых практыкаваннях за подпісам самога Белуна. Дарэчы, наведванне гэтай вёскі і музея ўжо ўключана ў шэраг турыстычных маршрутаў з серыі «Гудзевічы +», што створаны ў межах праекта «Вандроўка ў этнаказку». Сярод іх — «Цуд народнага мастацтва», «Гасцінцамі Белуна», «Сотні гадоў разам: слядамі яўрэйскай культуры», «Шляхамі драўлянага дойлідства». Праўда, рэканструкцыя музея не завершана і яшчэ патрабуе нямала сродкаў. Бюджэтных ці, можа, дзякуючы іншым міжнародным праектам?

Вузкакалейка працуе на турызм.

ЦІКАВЫ ТУРЫСТЫЧНЫ ПРАДУКТ ЁСЦЬ. ШТО ДАЛЕЙ?

Прэс-тур паказаў, што «Вандроўка ў этнаказку» можа быць вельмі захапляльнай і пазнавальнай — з дастойнай анімацыяй, калі турыст не проста назірае, а ўдзельнічае ў нейкім цікавым дзействе. Справа цяпер за галоўным: зрабіць гэты турыстычны прадукт як мага больш даступным найперш для жыхароў трансгранічнага рэгіёна, ды і, магчыма, не толькі іх. Наладзіць супрацоўніцтва ў гэтым кірунку паміж беларускімі і польскімі турфірмамі, прадумаць найбольш спрыяльныя для вандроўнікаў варыянты вырашэння візавых пытанняў. Першыя «ластаўкі» ўжо ёсць. Напрыклад, з казачным шляхам на Сувальшчыне нядаўна пазнаёміліся некалькі груп дзяцей з Ваўкавыска. А польскія турысты — частыя госці на аб'екце маршрута «Гасцінцамі Белуна» ў Старых Васілішках на Шчучыншчыне — у домемузеі Чэслава Немэна.

Ці возьмуцца за «раскрутку» маршрутаў «Вандроўкі ў этнаказку» нашы турфірмы, многія з якіх спецыялізуюцца на замежных курортах ды шоп-турах і пакуль яшчэ ніяк сябе не праявілі ва ўязным, пазнавальным турызме? Прыклад, пэўна, павінен паказаць рэгіянальны цэнтр турызму ГрДУ імя Я. Купалы — вядучага партнёра гэтага праекта.

Барыс ПРАКОПЧЫК

У адной з вёсак «Казачнага шляху» на Сувальшчыне.

Фота Сяргея ГАЎРЫЦКАГА.

■ Пераадоленне

ВЫЙСЦЕ З ЦЕМРЫ...

Вось што 95 гадоў дапамагае знаходзіць Магілёўская грамадская арганізацыя інвалідаў па зроку

Калі сустрэнеш гэтую жанчыну на вуліцы, ніколі не падумаеш, што яна яшчэ год таму адчувала сябе самым нешчаслівым на зямлі чалавекам. Прыгожая, падцягнутая, з прычоскай. Але гэта толькі звонку. Па начах ёй яшчэ сняцца кашмары аб тым, што нядаўна адбылося ў яе жыцці. З'явіліся праблемы са зрокам, а лячэнне, на якое яна ўскладала вялікія спадзяванні, аказалася няўдалым. Пасля аперацыі яна цалкам страціла вока, якое дагэтуль дрэнна, але ж бачыла. Цяпер на яго месцы пластмасавая накладка, пад якой жанчына хавае жахлівую рану.

«Сярод тых, хто бачыць, ты ўжо чужы»

Людміла Марчанка кажа, што тыя людзі, якія зрабілі яе інвалідам, цалкам адмовілі сваю віну. Яна на іх не крыўдуе, але тады здавалася, што ўвесь свет адвярнуўся ад яе. Жанчына і цяпер плача, калі ўспамінае гэтую сумную гісторыю. Ёй, вядома, цяжка. Але ўжо не так, як было тады. Проста пашчасціла знайсці тых, хто дапамог перажыць боль.

— Я і раней чула, што ёсць арганізацыя, якая курыруе сляпых, але, калі самой спатрэбілася дапамога, не ведала, дзе яна знаходзіцца і як дакладна называецца, — кажа яна. — Патэлефанавала ў даведку, і мне падказалі нумар. Але набраць яго адважылася не адразу. Вельмі баялася страціць апошнюю надзею. І толькі тады, калі зусім адчаялася, зняла тэлефонную трубку. Ужо праз паўгадзіны пасля майго «крыку аб дапамозе» пачуўся званок у дзверы...

Старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «БелТІЗ» Наталля Панцялеева — першая, хто падтрымаў яе і дапамог вярнуць упэўненасць у сабе. З гэтай сустрэчы, па сутнасці, і пачалося новае жыццё Людмілы Марчанкі. З тых знаёмых, каго Людміла ведала раней, засталіся адзінкі. І для такога публічнага чалавека, як яна (у мінулым выкладчыца аднаго з магілёўскіх ВНУ), страта была вельмі адчувальная. Яна і не ведала, што паміж відушчымі людзьмі і тымі, хто страціў зрок, такая прорва.

— Стан дарослага чалавека, які адчуваў сябе самастойнай асобай, а потым у адно імгненне стаў чымсьці накшталт бездапаможнага дзіцяці, нельга ўявіць так востра да таго моманту, пакуль сам у ім не апынешся, — дзеліцца яна. — Паспрабуйце завязаць сабе вочы і займацца звыклымі справамі. Нават даведацца, колькі гадзін, без радыё немагчыма. Калі мне расказалі, колькі існуе разумных рэчаў для сляпых людзей, я не паставала здзіўляцца. Як яны потым аблегчылі мне жыццё! Уявіце, нават існуе градуснік, які размаўляе. Пачуццё дыстанцыі са звычайным светам, у якім я жыла раней, на жаль, засталося, але цяпер я не адчуваю сябе нікчэмнай. Займаюся грамадскай працай, рукадзеллем.

Тыя праблемы, з якімі сутыкнулася, хвалююць шмат каго. Але па сабе ведаю, як цяжка зрабіць першы крок і вынесці самае патаемнае на грамадскае абмеркаванне. Трэба праявіць да сябе нейкую жорсткасць, прызнаць: сярод тых, хто бачыць, ты ўжо чужы. Трэба шукаць сабе падобных і мяняць свае зносіны ў сацыуме. Калі ведаеш, што ты не адзін, адчуваеш, як спадае напруга. І ты супакойваешся.

«Дыплом атрымала, але зрок пагоршыўся»

Але хапае людзей, якія яшчэ не знайшлі сваіх аднадумцаў. Сёння ў арганізацыі 1600 чалавек. Але іх значна больш, лічыць яе кіраўнік. Асабліва шмат тых, хто страціў зрок у сталым узросце.

— Для іх гэта самы страшны прысуд, — кажа Наталля Панцялеева. — Яны саромеюцца шукаць дапамогі, чапляюцца за нейкія зусім не зразумелыя прычыны. Гэтыя комплексы перашкаджаюць жыць на поўную моц. Штосьці не дае падзяліцца сваім горам — ім прасцей схавацца ў нейкую абалонку. Такія людзі страчваюць веру ў сябе, становяцца азлобленымі і агрэсіўнымі.

Чалавек — істота сацыяльная, таму застацца сам-насам са сваёй праблемай заўсёды страшна. Са стратай зроку з'яўляецца шмат забарон, папярэджанняў, складанасцяў. «Я сама ў дзяцінстве вельмі саромелася таго, што бачу дрэнна, — успамінае Наталля Панцялеева. — Вельмі баялася, што гэта перашкодзіць мне паступіць у тэхналагічны інстытут, і я нават папрасіла сяброўку сходзіць замест мяне да акуліста. Дыплом я атрымала, але зрок яшчэ больш пагоршыўся. Трэба было рабіць шмат чарцяжоў, а гэта вялікая нагрузка на вочы».

Насамрэч, спецыяльнасцяў, якія маюць магчымасць атрымаць сляпыя (асабліва тыя, хто не бачыць зусім), вельмі мала. Найбольш запатрабаваныя з іх — музыканты і масажысты. Але ж не ўсім Бог дае талент. І як тады жыць далей, чым зарабляць на жыццё?

— Вось Паша Міхайлаў з Клімавічаў марыць аб радыётэхнічнай ВНУ, хоча стаць праграмістам, — кажа Наталля Панцялеева. — Не хочацца расчароўваць хлопца, але ж яго туды ніхто не возьме. Там розныя мікрасхемы, чарцяжы, а для чалавека з праблемным зрокам — гэта прысуд свайму здароўю. Адна дзяўчына з Клімавічаў, нягледзячы на тое, што ў яе дрэнны зрок, насуперак усяму паступіла ў медыцынскую ВНУ, але праз год вымушана была сысці. Падала дакументы ў медыцынскі каледж на фармацэўта, але праз паўтара года забрала іх і адтуль. Звярнулася да нас толькі тады, калі амаль цалкам страціла зрок.

Стан дарослага чалавека, які адчуваў сябе самастойнай асобай, а потым у адно імгненне стаў чымсьці накшталт бездапаможнага дзіцяці, нельга ўявіць так востра да таго моманту, пакуль сам у ім не апынешся.

У канцы навучальнага года арганізацыя праз дзіцячыя паліклінікі вобласці шукала маладых людзей, якія маюць праблемы са зрокам. Каля 30 паштовак было накіравана па розных адрасах з прапановай звярнацца па дапамогу. Асабліва запатрабаванай аказалася інфармацыя па навучальных установах, дзе створаны ўмовы для сляпых. Напрыклад, калі ёсць музычныя здольнасці, можна адправіцца ў Курск — там знаходзіцца спецыялізаванае вучылішча для невідушчых. Усім ахвотным арганізацыя дапамагае зрабіць запыты ва ўстановы адукацыі, дае карысныя парады.

Не адмаўляюць тут і тым, хто шукае сабе працу. Адна дзяўчынка са Шклова такім чынам працаўладкавалася адміністратарам у Мінску. Калі няма ніякай спецыяльнасці, падабраць нешта будзе цяжэй.

Вельмі вялікія спадзяванні кіраўніцтва арганізацыі ўскладае на тое, што ў Магілёве на базе эканамічнага прафесійнатэхнічнага каледжа будзе створана група аператараў ПЭВМ для зусім невідушчых. Дзякуючы спецыяльным праграмам сёння можна асвоіць камп'ютар, нават не маючы зроку. Як высветлілася, дырэктар адукацыйнай установы Алег Бахановіч не супраць такога супрацоўніцтва. Справа добрая: гэта дасць магчымасць невідушчым падлеткам прыносіць карысць грамадству ў якасці дыспетчараў з веданнем асноў ЭВМ. Але пакуль гэта будзе пілотны праект. Каб рыхтаваць такіх спецыялістаў, трэба, каб рашэнне было адобрана на дзяржаўным узроўні і ўзгоднена паміж рознымі зацікаўленымі міністэрствамі. Інакш у маладых спецыялістаў могуць узнікнуць праблемы з працаўладкаваннем.

Інструктар Генадзь Лаўрыненка дэманструе лупу з фотафіксатарам, якая не толькі павялічвае малюнак, але і нейкі час захоўвае яго на сваёй паверхні.

«Можна наракаць на ўвесь свет, але што зменіцца?..»

На жаль, праблемы сляпых для відушчых не заўсёды зразумелы. Дакладней, некаторыя іх вельмі не жадаюць заўважаць. Колькі разоў арганізацыя звярталася ў кіраўніцтва МДУ імя Куляшова, каб зрабілі разметку на прыступках, але воз і дагэтуль там. І гэта пры тым, што сярод студэнтаў ёсць і зусім невідушчыя. Наталля Панцялеева звярталіся нават у Міністэрства адукацыі, каб паспрыялі. Але год прайшоў — і ніякіх зрухаў.

Здараюцца нават кур'ёзы. На чыгуначным вакзале доўга адмаўляліся ад спецыяльнай разметкі, матывуючы тым, што будынак — архітэктурны помнік. Але калі мінскае кіраўніцтва параіла прыслухацца да зваротаў, жоўтыя палоскі на прыступках хуценька з'явіліся.

Нязручнасцяў у жыцці хапае, але ніколі не трэба апускаць рукі, лічаць у арганізацыі. Можна бясконца наракаць на ўвесь свет і плакаць аб сваім няўдалым лёсе, можна вінаваціць у сваіх няшчасцях усіх і ўся. Але што ад гэтага зменіцца? Жыць у цемры, вядома, вельмі цяжка, але можна. Захапляюся, іншага слова тут не падабраць, маладым хлопцам з Магілёва Паўлам Паўлавым, які дзеля сваёй мэты — стаць святаром — не пабаяўся паехаць у далёкі ўкраінскі горад Пачаева і паступіць у семінарыю. Сёння ён спасцігае багаслоўскую навуку ў Кіеўскай духоўнай акадэміі. Ці не прыклад для пераймання Саша Зорка з Касцюковічаў, які скончыў Мінскі лінгвістычны ўніверсітэт, а потым знайшоў сябе ў спорце і стаў паралімпійцам? І тое, што існуе такая грамадская арганізацыя, якая можа дапамагчы і падказаць шлях у будучыню, вельмі каштоўна. Сёлета яна адзначае сваё 95-годдзе. І тых, хто ёй у гэтыя дні кажа «дзякуй», вельмі шмат.

— Мы адкрыты для ўсіх, — запэўнівае Наталля Панцялеева. — Дапамагаем атрымаць адукацыю, знайсці работу, навучыцца нейкаму рамяству. А яшчэ даём кансультацыі, парады, сродкі рэабілітацыі, усталёўваем спецыяльныя праграмы на камп'ютар, забяспечваем сродкамі для агучвання літаратуры. Ведаем, як цяжка чалавеку, які страціў зрок, атрымаць паўнавартасную медыцынскую кансультацыю. Не адчайвайцеся — мы дапаможам, падкажам. Сёння вельмі шмат выпадкаў, калі чалавеку даюць трэцюю, працоўную, групу інваліднасці, хаця яму, па сутнасці, проціпаказана цяжкая праца. Наймальнікі не зацікаўлены ў такіх супрацоўніках і вельмі часта проста адмаўляюць ім. Мы ведаем, чым дапамагчы і гэтым людзям. Апошнім часам стала павялічвацца колькасць маладых людзей, якія маюць праблемы са зрокам, не кажучы пра пенсіянераў. Яны прыстасоўваюцца да жыцця, баяцца нават сабе прызнацца, што ў іх праблемы. А так быць не павінна. Прыходзьце да нас. Мы не проста супакоім вас, але і дапаможам вярнуцца да паўнацэннага жыцця.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

«СКАРБ УСІХ НА СВЕЦЕ ЛЮДЗЕЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вялікі наш пісьменнік толькі марыў, каб Белавежская пушча стала нечым накшталт нацыянальнага парку. А сёння яна гэты статус мае. Відавочна, што і міжнародныя эксперты, і нашы навукоўцы ідуць тым шляхам, які напрарочыў Уладзімір Караткевіч яшчэ ў 1971 годзе.

Ужо ў 1979 годзе ў прэстыжны Спіс сусветнай спадчыны была ўключана частка пушчы на польскім баку пад назвай «Белавежскі нацыянальны парк». А ў снежні 1992 года ўчастак высокаўзроставага лесу нашага Нацыянальнага парку быў занесены ў Спіс сусветнай спадчыны чалавецтва. На наступны год пушча атрымала міжнародны статус біясфернага запаведніка, а напрыканцы 1997 года Савет Еўропы ўзнагародзіў Нацыянальны парк Еўрапейскім дыпломам.

Але навукоўцы нацыянальнага парку ставілі перад сабой задачу дабіцца міжнароднага прызнання ўсёй пушчы як адзінага ўнікальнага прыроднага комплексу. Работа па падрыхтоўцы матэрыялаў заняла не адзін год.

Як расказаў намеснік дырэктара нацыянальнага парку па навукова-даследнай працы Васіль Арнольбік, ідэю намінацый па новых крытэрыях у новых межах на гэты раз падказалі прадстаўнікі Міжнароднага саюза аховы прыроды. Яны ж пакінулі шэраг рэкамендацый, выкананне якіх дазволіла намініраваць векавы лес на прэтэндэнты ў спісы найпрыгажэйшай спадчыны чалавецтва. Эксперты ўказалі таксама на магчымасць намінацыі яшчэ па двух крытэрыях — выключна высокай біялагічнай разнастайнасці і значэнні для эвалюцыі відаў і экасістэм. Беларускія навукоўцы разам з польскімі суседзямі ўзяліся за работу. Выпрацавалі комплекс мерапрыемстваў, якія паспрыяюць захаванню пушчы, а таксама стварылі структуру сумеснага кіравання гэтай тэрыторыяй. Яшчэ тады вучоныя зазначалі, што незалежна ад таго, зацвердзіць камітэт Сусветнай спадчыны новы статус ці не, праведзеная работа не прападзе. Яна паслужыць на карысць пушчы. Але намаганні многіх і многіх людзей з абедзвюх краін увянчаліся поспехам, і Белавежская пушча атрымала яшчэ большае прызнанне на сусветным узроўні.

Паводле слоў старшага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага парку Дзмітрыя Бярнадскага, падчас падрыхтоўкі названага дасье былі перагледжаны запаведныя тэрыторыі. Землі, якія не мелі дачынення да гістарычнай пушчы, выключылі, гаворка ідзе найперш пра лясы, якія пасадзілі пасля Другой сусветнай вайны. Затое на карце з'явіўся размешчаны на паўночна-ўсходняй ускраіне запаведніка лесабалотны комплекс «Дзікое», экалагічна і гідралагічна звязаны з Белавежскай пушчай.

Новы статус пушчы як аб'екта сусветнай спадчыны тут разглядаюць не толькі як асаблівы гонар. Гэта дае падставу разглядаць новыя праекты па аднаўленні і захаванні лесу не толькі на ўзроўні краіны, але і з падтрымкай міжнароднай супольнасці. Пушча — наша агульнае багацце, яна дзеліцца кіслародам з людзьмі, не зважаючы на дзяржаўныя межы і нацыянальную прыналежнасць. Таму і зберагаць лес трэба разам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота БЕЛТА.

МАСКОЎСКІ ПАДАРУНАК ЗЕМЛЯКОЎ

Нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Масквы» выдала кнігу «Рэспубліка-партызанка». Зборнік артыкулаў прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Выданне з'яўляецца вынікам навуковай дзейнасці супрацоўнікаў Навукова-даследчага цэнтра гісторыі дыяспар гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава, Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, Навукова-даследчага Цэнтра фундаментальнай шматтомнай працы «Вялікая Айчынная вайна 1941 — 1945 гадоў».

Адкрываецца зборнік грунтоўным даследаваннем Сяргея Кандыбовіча, Вячаслава Даніловіча і Аксаны Солапавай «Грамадскія партызанскія аб'яднанні Расіі і Беларусі: 70 гадоў гісторыі». Пра падпольны рух у пярэдадзень вызвалення расказвае доктар гістарычных навук Аляксандр Каваленя. Сярод аўтараў кнігі — беларускія і расійскія гісторыкі Барыс Далгатовіч, Уладзімір Здановіч, Аксана Солапава, Аляксей Гусеў, Аксана Казапалянская, Майя Бабенка і інш. Асобным раздзелам прадстаўлены ў зборніку ўспаміны нашых землякоў, лёс якіх звязаны з Масквой: кінарэжысёра Аляксандра Ульянава, актрысы Марыяны Мадоравай-Патапавай, генерал-лейтэнанта Вячаслава Раманава, дзяржаўных, палітычных дзеячаў Кандрата Цераха, Віктара Шавялухі і інш. Выдадзеная накладам 1000 экзэмпляраў, кніга «Рэспубліка-партызанка», несумненна, добры ўнёсак у вывучэнне ваеннай гісторыі нашай Айчыны. Спадзяёмся, што заўважаць яе не толькі ў Маскве, але і ў Беларусі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

■ Кашалёк

ВЫРАСЛІ ЦЭНЫ НА ПАСЛУГІ ДАІ

Прысутнасць супрацоўніка аўтаінспекцыі на экзамене будзе каштаваць 40 тысяч рублёў у гадзіну

Рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства эканомікі № 47 ад 20 чэрвеня 2014 года, якое афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У прыватнасці, выезд супрацоўніка ДАІ ў вучэбную арганізацыю для прыёму кваліфікацыйнага экзамену на права кіравання механічным транспартным сродкам, правядзення заняткаў па правілах дарожнага руху абыдзецца па тарыфнай стаўцы на ўзроўні 40 тыс. рублёў у гадзіну. Прадастаўленне аўтадрома для навучання кіраванню (на аўтамабілі ўладальніка) каштуе з гэтага часу 12 тыс. у гадзіну. Выдача камплекту копій дакументаў, якія паслужылі падставай для рэгістрацыі транспартнага сродку, будзе каштаваць 22 тыс., а камплекты копій матэрыялаў справы аб адміністрацыйным правапарушэнні — 25 тыс.

Удзел супрацоўніка ДАІ ў пасяджэннях прыёмных камісій і прыёмачных, кваліфікацыйных і іншых выпрабаваннях транспартных сродкаў, а таксама частак іх канструкцыі і дадатковага абсталявання ацэнена ў 150 тыс.

Суправаджэнне аўтамабілем ДАІ цяжкавагавых або буйнагабарытных транспартных сродкаў, небяспечных грузаў пры іх перавозцы ў межах населенага пункта ацэньваецца ў залежнасці ад дальнасці паездкі. На адлегласць да 10 км уключна такая паслуга абыдзецца ў 90 тыс.; на адлегласць да 20 км — 140 тыс.; на адлегласць звыш 20 км — 180 тыс. За суправаджэнне названай катэгорыі транспартных сродкаў па-за межамі населенага пункта кожны кіламетр прабегу аплачваецца па тарыфе ў 5,5 тыс. рублёў за 1 км. Узгадненне зместу інфармацыі на папяровых і электронных носьбітах, якая закранае сферу бяспекі дарожнага руху, ацэнена ў 90 тыс. за адзін умоўны друкаваны ліст.

Дакумент уступае ў сілу праз 5 дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ

■

Фота БЕЛТА.

■ Падарожжа з камфортам

ПРЫБАЛТЫЙСКІЯ АЭРАПОРТЫ СТАЛІ БЛІЖЭЙ

Гэтым летам беларускія аматары падарожжаў змогуць патрапіць на рэйсавым аўтобусе з Мінска ў аэрапорты Вільнюса і Каўнаса, паведамляе сайт Вільнюскага аэрапорта.

Прадпрыемства «Лаўкост», якое ўваходзіць у склад дзеючай у Мінску транспартнай групы «Алізана», пачынае выконваць экспрэс-рэйсы па маршруце Мінск-Каўнаскі аэрапорт і назад. Цяпер такі маршрут будзе дапоўнены прыпынкам і ў Вільнюскім аэрапорце.

У час летняга авіяцыйнага сезона экспрэс-рэйсы з Мінскага аэрапорта ў Вільнюскі і Каўнаскі будуць ажыццяўляцца два разы на дзень новымі пасажырскімі міні-аўтобусамі Mercedes. Падчас зімовага сезона перавозка будзе арганізавана з улікам раскладаў рэйсаў.

Цяпер пасажыры з Мінска могуць патрапіць у Вільнюс самалётам, цягніком ці аўтамабілем, а Каўнас з'яўляецца не такім даступным. «Таму мы арыентуемся на напрамкі Каўнаскага аэрапорта, якія ахопліваюць большую частку Паўднёвай Еўропы, а таксама шырокую карту рэйсаў з Вільнюса і імкнёмся стварыць яшчэ адзін зручны спосаб для беларускага пасажыра вылецець з Літвы «, — растлумачыў кіраўнік транспартнай групы «Алізана» Андрэй Алексяюк.

Паводле інфармацыі генеральнага дырэктара ДП «Аэрапорты Літвы» Гедымінаса Алмантаса, звыш 10% пасажыраў, якія ляцяць праз Каўнас, складаюць беларусы. Больш за тое, сёлета паток гэтых пасажыраў павялічваецца яшчэ больш імкліва. Падчас гэтага летняга авіяцыйнага сезона Каўнас прапануе шмат мэтавых напрамкаў авіякампаніі Ryanair для адпачынкаў, таму с вялікай верагоднасцю чакаецца яшчэ большы аб'ём беларускіх пасажыраў. Вільнюс робіцца сапраўды даступным для жыхароў Мінска як па паветры (прамыя рэйсы Belavia), так і наземным грамадскім транспартам — цягнікамі і аўтобусамі. Цяпер пасажыры з беларускай сталіцы змогуць па рэйсавым маршруце трапіць у Вільнюскі аэрапорт праз 2 гадзіны пасля выезду з Мінска, а ў Каўнаскі аэрапорт — праз 3 гадзіны.

Сяргей ПАЛІНІН

■

■ Палёт нармальны!

Чвэрць мільёна за чэрвень

Мінулы месяц стаў рэкордным для айчыннай авіякампаніі па колькасці перавезеных пасажыраў, калі паслугамі перавозчыка скарысталася ажно 250 725 чалавек, што на 27,6% больш за леташні паказчык. Усяго ў першым паўгоддзі пасажырапаток дасягнуў амаль 800 тыс. чалавек, што складае 120,1% да аналагічнага перыяду мінулага года. Студзень-чэрвень для «Белавія» таксама адзначаны ростам грузавых авіяперавозак. Авіякампанія зафіксавала рост аб'ёмаў перавезеных грузаў і пошты на 12,6%.

Паводле інфармацыі прэс-службы кампаніі «Белавія», у канцы красавіка рэгулярная маршрутная сетка авіякампаніі папоўнілася яшчэ двума напрамкамі. Напярэдадні адпускнога сезона адкрыты рэгулярны рэйс у Ніцу. А 30 красавіка адбыўся першы рэйс у Краснадар, які стаў сёмым пунктам прызначэння ў Расійскай Федэрацыі. У пачатку чэрвеня «Белавія» стала выконваць унутрырэспубліканскія перавозкі паміж Мінскам і Гомелем. Акрамя гэтага, павялічваецца частата выканання рэйсаў па многіх ужо існуючых напрамках.

Разам з павелічэннем колькасці рэгулярных напрамкаў, сумесна з аператарамі-партнёрамі сёлета «Белавія» значна пашырыла прапанову па чартарных праграмах. Упершыню ў гэтым сезоне беларускія турысты могуць паляцець у Туніс і Румынію з Мінска. Таксама сёлета ўжо запланавана рэкордная колькасць палётаў з абласных цэнтраў: чартарныя рэйсы ў Бургас будуць ажыццяўляцца з Брэста і Гомеля, рэйсы ў Анталію — з Брэста і Віцебска, а таксама ў Салонікі з Гомеля.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Факт

БЕЗ ВІЗЫ — З БІЯМЕТРЫЧНЫМ ПАШПАРТАМ

Літаральна праз два месяцы Ізраіль плануе ўкараніць бязвізавы рэжым для грамадзян нашай краіны.

Паводле слоў намесніка міністра ўнутраных спраў Ізраіля Фаіны КІРШЭНБАЎМ, пытанне ўжо вырашана на ўзроўні МУС. Цяпер праект сумеснага дагавора разглядаецца Міністэрствам замежных спраў, пасля чаго павінен атрымаць падтрымку парламентарыяў. Гэтая работа не павінна заняць больш за два месяцы.

Дэлегацыя Дзяржавы Ізраіль на чале з намеснікам міністра ўнутраных спраў Фаінай Кіршэнбаўм наведала Беларусь дзеля ўмацавання супрацоўніцтва ў праваахоўнай галіне і абмену вопытам у процідзеянні злачыннасці. Замежныя госці сустрэліся з кіраўніком міліцэйскага ведамства Беларусі Ігарам Шуневічам і яго намеснікам Мікалаем Мельчанкам. Бакі будуць абмяркоўваць пытанні іміграцыі, барацьбы з нелегальнай міграцыяй і гандлем людзьмі, магчымасці выкарыстання біяметрычных баз даных, прынцыпы іх работы і спосабы захоўвання інфармацыі, а таксама ўзаемадзеянне двух ведамстваў ва ўмовах адмены візавага рэжыму паміж Ізраілем і Беларуссю.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Куплю любое авто. 8 029 6510099 Велком, 8 029 7918210 МТС

Утерянное свидетельство о регистрации индивидуального предпринимателя Пахомовой Натальи Петровны, УНН 190066507 от 24.02.2000 г., **считать недействительным.**

■ Навіны сталіцы

КІРОЎЦЫ ЭВАКУАТАРАЎ ПРАЦУЮЦЬ У ДЗВЕ ЗМЕНЫ

У Мінску з 1 ліпеня арганізавана другая змена працы кіроўцаў эвакуатараў транспартных сродкаў, паведаміў дырэктар ГА «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» Аляксандр КАНАШ.

Першая змена пачынаецца ў 7.30 і заканчваецца ў 15.00, другая доўжыцца з 15.00 да 22.00. У перспектыве плануецца кругласутачны рэжым працы эвакуатараў. Па словах А. Канаш, за першыя шэсць месяцаў гэтага года на стаянкі аб'яднання эвакуіраваны 8673 аўтамабілі. Выручка за захоўванне гэтых транспартных сродкаў склала 1,1 млрд рублёў, за прымусовую эвакуацыю — 2,6 млрд рублёў.

Глафіра ЛЯТКОЎСКАЯ, *«Мінск — Навіны»*

■

Гэта сацыяльна актыўныя людзі, заўсёды гатовыя прадставіць уласную думку па любым пытанні. Яны маюць вузкае кола сяброў, ахоўваюць свой унутраны свет ад чужых вачэй, любяць сакрэтнічаць. У выпадку неабходнасці гэтыя людзі выступаюць спрытнымі лгунамі, якія сеюць дэзынфармацыю з мэтай звяржэння сапернікаў. Яны ніколі не бяруць на сябе ролю лідараў, баючыся адказнасці. Іх турбуе знешні выгляд і інтэр'ер дома, яны маюць некаторыя рысы нарцысізму. Ім неабходна памятаць, што нельга замыкацца ў матэрыяльным свеце, забываючыся на духоўныя каштоўнасці.

НАРОДЖАНЫЯ 11 ліпеня

Наблюдательный совет открытого акционерного общества «ДСТ № 2, г. Гомель» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 29 июля 2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж (зал совещаний).

Повестка дня:

1. О начислении и выплате дивидендов за 1-2 кварталы 2014 года.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — 10 июля 2014 г.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

УНП 400022426

21 июля 2014 года в 14.00
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «Вишневка-2010»
по адресу: Минская область, Минский район, агрогородок Вишневка, ул. Центральная, 1А (актовый зал).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об уменьшении Уставного фонда ОАО «Вишневка-2010» путем аннулирования простых (обыкновенных) акций в количестве 52 577 штук на сумму 2 313 388 000 бел. руб., выкупленных акционерным обществом по требованию акционеров в результате реорганизации ОАО «Вишневка-2010» и утверждении нового Уставного фонда ОАО «Вишневка-2010» в размере 44 776 512 000 бел. руб.
2. Об избрании членов Наблюдательного совета.

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 21 июля 2014 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 600041880 *Наблюдательный совет ОАО «Вишневка-2010».*

22 июля 2014 года в 12.00. состоится совместное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна» и акционеров присоединяемого ОАО «Промтовары-Пинск».

Повестка дня:

1) Об утверждении передаточного акта.
2) Об уставном фонде ОАО «Татьяна».
3) Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Татьяна».
4) О распределении акций дополнительного выпуска среди акционеров присоединяемого общества.
5) О внесении изменений в устав ОАО «Татьяна» и утверждении устава общества в новой редакции.

Местонахождение ОАО «Татьяна»: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Время регистрации в день проведения собрания: с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.07.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400068248 Наблюдательный совет.

УТЕРЕННЫЕ БЛАНКИ СТРОГОЙ ОТЧЕТНОСТИ ЗАСО « БЕЛНЕФТЕСТРАХ» СЕРИИ **ВС** 8552427**;** 8552432; 8552441**;** 7047387**;** 7047466**;** 7420290**;** 7456461**;** 7456534**;** 8403768**;** 8403796; 8417689; 8417704; 8417796; 8417815; 8437626; 8437763; 8550570; 8550850; СЕРИИ **ВР** 0225230; 2939002; 2939007; 0243460; 0243503; 0243504; 0243514; 0263035; 0263050; 0982109; 0982111; 1253216; КВИТАНЦИИ 1 СУ СЕРИИ **КС** 0567590; 3174588; 3527532; 3534564; 3534577; 3534592; 3534594; 3535884; 3535894; 3535929; 3561042 СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ.

Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»

28 июля 2014 года
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «Белхим»,
расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.
Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 (зал заседаний)».

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О выплате дивидендов за второй квартал 2014 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34 с 17 по 25 июля 2014 года (время работы с 9.00 до 16.30).** Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 25.07. 2014 года.

Регистрация участников собрания – 28 июля 2014 года с 09.00 до 10.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 28 июля 2014 года в 10 часов 00 минут.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

УНП 100122846

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 11 августа 2014 года торгов по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)		Инв. № кадастровый
	Производственный корпус с трансформаторной подстанцией, общая площадь 734,1 кв.м (назначение: здание неустановленного назначения; составные части и принадлежности: производственный корпус готовностью 68% с трансформаторной подстанцией готовностью 49%)	602/U-49786
	АБК с пристроенными помещениями производственного назначения со скважиной и водонапорной башней, общая площадь 1339,2 кв.м (назначение: здание неустановленного назначения; составные части и принадлежности: АБК готовностью 42%, с пристроенными помещениями производственного назначения готовностью 21%, навесом готовностью 70%, со скважиной готовностью 100% и водонапорной башней готовностью 100%)	602/U-49784
Сведения о земельных участках	Кадастровый номер 624484800001000234, площадь – 1,9869 га, назначение – строительство экспериментального завода по производству карбита кальция и углекислоты, очистных сооружений; кадастровый номер 624484800001000235, площадь – 0,1555 га, назначение – строительство экспериментального завода по производству карбита кальция и углекислоты, очистных сооружений	
Местонахождение продаваемого имущества	Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский р-н, Пережирский с/с, 10	
Сведения о продавце	ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск	
Сведения об организаторе торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск	
Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС)	2 436 805 993 белорусских рубля	
Сумма задатка	240 000 000 белорусских рублей	

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (покупатель) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **11 августа 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.07.2014 по 07.08.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

МТБанк

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2014 г.	2013 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		247 558	228 524
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		267 981	379 039
5	Средства в банках	1104		432 242	212 133
6	Ценные бумаги	1105		514 734	467 907
7	Кредиты клиентам	1106		2 920 037	2 772 729
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		244	244
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		134 064	77 198
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	6
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		62 012	72 074
14	ИТОГО активы	11		4 578 872	4 209 854
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		623 702	626 142
18	Средства клиентов	1203		3 089 544	2 991 485
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		294 177	158 198
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		49 571	57 572
23	ВСЕГО обязательства	120		4 056 994	3 833 397
24	**КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		121 857	121 857
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		53 494	17 234
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		25 680	25 727
29	Накопленная прибыль	1215		320 847	211 639
30	Всего капитал	121		521 878	376 457
31	ИТОГО обязательства и капитал	12		4 578 872	4 209 854

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2 квартал 2014 года

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2014 г.	2013 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		503 011	340 786
2	Процентные расходы	2012		340 314	273 036
3	Чистые процентные доходы	201		162 697	67 750
4	Комиссионные доходы	2021		208 996	199 666
5	Комиссионные расходы	2022		26 889	22 582
6	Чистые комиссионные доходы	202		182 107	177 084
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		9 753	1 744
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		32 013	21 455
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-71	125
11	Чистые отчисления в резервы	207		131 121	36 655
12	Прочие доходы	208		22 492	24 967
13	Операционные расходы	209		181 589	130 334
14	Прочие расходы	210		11 253	23 631
15	Прибыль(убыток) до налогообложения	211		85 028	102 505
16	Расход(доход) по налогу на прибыль	212		10 952	12 963
17	ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК)	2		74 076	89 542

И.о. Руководителя **И.П. Бычек**

И.о. Главного бухгалтера **Л.К. Левкович**

Дата подписания 8 июля 2014 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года на следующие виды деятельности. УНП 100394906

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 11 августа 2014 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С. М. КИРОВА»

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	Здание специализированное транспорта общей площадью 49,1 кв.м, инвентарный номер 500/С-43545, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, 21/7
Сведения о продавце	ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С. М. КИРОВА», ул. Красноармейская, 21, 220030, г. Минск
Сведения об организаторе торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	19 400 долларов США
Сумма задатка	17 000 000 белорусских рублей

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С.М. КИРОВА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (покупатель) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС производится победителем торгов (покупателем) в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи, по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **11 августа 2014 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.07.2014 по 07.08.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017)327-81-40, (ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С. М. КИРОВА»).

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. ПРУЖАНЫ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ

Аукцион состоится 25 июля 2014 года в 14.00 по адресу: г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, 17, каб. 321 (малый зал)

Номер лота, местонахождение участка	Лот 1 г. Пружаны, ул. Цветочная, 1	Лот 2 г. Пружаны, ул. Солнечная, 2	Лот 3 г. Пружаны, ул. Яблоневая, 16
Площадь, га	0,0934	0,0937	0,1317
Кадастровый номер	125650100001004624	125650100001004623	125650100001003929
Начальная цена, руб.	43000000	43000000	50269400
Расходы по формированию земельного участка (в том числе государственной регистрацией), руб.	5599500	5599500	
Сумма задатка	4000000	4000000	5000000
Целевое назначение (назначение в соответствии с единой классификацией)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (код 10902, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (код 10902, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (код 10902, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Пружаны ул. Г. Ширмы, 17, каб. 114 (землеустроительная служба) с 8.00 до 17.00 по рабочим дням до 21 июля включительно.

Победителю аукциона предоставляется возможность рассрочки внесения платы за земельный участок.

Более подробная информация опубликована в газете «Звязда» от 24.04.2014 № 76.

Контактный телефон в г. Пружаны 8 (01632) 91369.

УНП 200143630

■ Інфарм-укол

Перагрэліся?

Дзецям, пажылым, усім, хто пакутуе ад хвароб сістэмы кровазвароту і парушэння абмену рэчываў (захворванняў шчытападобнай залозы, цукровага дыябету, атлусцення і інш.) вельмі важна ўлічваць час знаходжання на сонцы. Наогул празмернае знаходжанне пад сонечнымі промнямі небяспечна для ўсіх, паколькі пагаршае тэрмарэгуляцыю, нагадвае валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі Алена ГАРНІЦКАЯ.

Тэмпература цела залежыць ад суадносін працэсаў утварэння цеплыні ў арганізме і аддачы цеплыні ў знешняе асяроддзе. Пры павышэнні тэмпературы навакольнага асяроддзя да 25-30 градусаў, высокай вільготнасці і працяглым знаходжанні на сонцы аддача цеплыні абцяжарваецца, што прыводзіць да перагравання арганізма. Гэтаму спрыяюць таксама цёплае або сінтэтычнае адзенне, фізічныя нагрузкі, парушэнне пітнога рэжыму, адсутнасць галаўнога ўбора.

ЯК ПРАЯЎЛЯЕЦЦА ПЕРАГРАВАННЕ?

Слабасцю, кволасцю, стомленасцю, санлівасцю, галаўным болем, смагай, пачырваненнем і вільготнасцю скуры, пачашчаным пульсам і дыханнем на фоне нармальнай тэмпературы цела. Аднак паступова тэмпература павышаецца да 39-40 градусаў, нарастае галаўны боль, з'яўляюцца галавакружэнне, шум у вушах, млосць, ваніты, узмацняецца потааддзяленне. Ціск зніжаецца, развіваецца слабасць сардэчнай дзейнасці, дыханне становіцца рэдкім. Магчыма страта свядомасці, сутаргі. Цяжкі стан — гэта сухая скура, частае і павярхоўнае дыханне, часты пульс, нізкі ціск. Калі чалавеку не аказаць першую медыцынскую дапамогу, яму пагражае кома са смяротным зыходам.

ЯК ПРАЯЎЛЯЕЦЦА СОНЕЧНЫ ЎДАР?

Сонечны ўдар — гэта паражэнне цэнтральнай нервовай сістэмы (галаўнога мозга) у выніку ўздзеяння прамых сонечных промняў на галаву. Праявіцца такі стан можа не толькі ў момант знаходжання на сонцы, але і праз 6-8 гадзін.

Пацярпелы адчувае разбітасць, павышэнне тэмпературы цела, адзначае пачырваненне скуры твару, галаўны боль, галавакружэнне, з'яўленне шуму ў вушах, «мушак» перад вачыма. Могуць быць ваніты і млосць, часты пульс і дыханне, павышанае потааддзяленне, кровацячэнні з носа. Цяжкі стан — моцны галаўны боль, тэмпература цела — 40 градусаў, нізкі артэрыяльны ціск, страта свядомасці, парушэнне дыхання і сутаргі.

У спёку ў душным памяшканні або транспарце можна страціць прытомнасць і без папярэдняга перагрэву ці знаходжання на сонцы. Звычайна пры гэтым адчуваецца слабасць, галавакружэнне, цямнее ў вачах, нямеюць рукі і ногі. Бывае, што гэтым і заканчваецца, але часам чалавек становіцца бледным, пакрываецца халодным потам, канечнасці халадзеюць, і ён страчвае прытомнасць.

ШТО ЗРАБІЦЬ НЕАДКЛАДНА?

Навакольныя павінны дапамагчы такому пацярпеламу.

✓ Пакласці на спіну, падкласці што-небудзь пад галаву, каб палепшыць прыток крыві да галавы.

✓ Расшпіліць адзенне, гальштук.

✓ Можна даць халоднай вады (па магчымасці, крыху падсоленай) або моцнага халоднага чаю.

✓ Пакласці пад галаву халодны кампрэс (мокры ручнік), або намачыць галаву халоднай вадой, або прыкласці лёд ці бутэлькі з халоднай вадой.

✓ Калі дыханне слабае — выклікаць «хуткую». Пры адсутнасці пульсу зрабіць непрамы масаж сэрца. Даць удыхнуць нашатырны спірт.

КАБ НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПЕРАГРЭВУ

1. Пазбягайце працяглага знаходжання на сонцы.

2. Карыстайцеся крэмам (гелем, ласьёнам) з сонцаахоўным эфектам.

3. Апранайце свабоднае адзенне.

4. Піце больш (негазіраванай) вады, халоднага несалодкага чаю, натуральнага морсу. Салодкія газіраваныя напоі толькі ўзмацняюць смагу.

5. Апырсквайце рукі і твар халоднай вадой.

6. Не карыстайцеся касметыкай (у тым ліку на спірце), якая павышае адчувальнасць скуры да сонечных апёкаў і можа прывесці да стойкіх пігментных плям.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Вакол футбола

«ПА РЫА З НАМІ ХАДЗІЎ АСАБІСТЫ АХОЎНІК»

Футбольнае свята вачыма беларускай турысткі

Калі ростар першынства свету складзены з 32 зборных, балельшчыцкая армада на трыбунах бразільскіх стадыёнаў прадстаўлена больш шырока. Наведалі матчы першынства і нашы суайчыннікі. Сярод іх — Ірына ПІСКУНОВА, мастачка, якая разам з пляменнікам Ягорам Янкавенкам, пераможцам творчага конкурсу «На чэмпіянат свету па футболе FIFA 2014 разам з МакДональдс» правяла ў Рыа-дэ-Жанэйра пяць дзён і наведала паядынак паміж Бельгіяй і Расіяй.

Ірына Піскунова і Ягор Янкавенка.

«КАЛІ ІДЗЕ ФУТБОЛЬНЫ МАТЧ, ЛЮДЗІ АМАЛЬ НЕ ПРАЦУЮЦЬ»

Яшчэ месяц таму сам Ягор прызнаваўся, што для яго выйгрыш білетаў на вялікі футбол у конкурсе — гэта сапраўдная мара. Упэўнены, падпішацца пад яго словамі і Ірына, якая вярнулася з Рыа з «сакваяжам» прыемных успамінаў.

— Калі прыляцелі дадому, у мяне было адчуванне, што мы не проста наведалі другую краіну, а пабывалі на іншай планеце, — прызнаецца Ірына Піскунова і думкамі вяртаецца ў сонечную Паўднёвую Амерыку. — Бразілія — дзівосная краіна. Як прыляцелі туды, адразу акунуліся ў футбольнае свята. Гэта было відаць і па тым, што кожны кожнаму ўсміхаецца. У такой атмасферы ты пераймаеш у бразільцаў эстафету і сам пачынаеш усім усміхацца. На душы было радасна з першых хвілін знаходжання ў Рыа-дэ-Жанэйра. У гэты горад улюбляешся з першага погляду. Сам па сабе ён вельмі незвычайны: знаходзіцца на ўзбярэжжы заліва Гуанабара ў акружэнні велічных гор. Добра вядомую статую Хрыста Збавіцеля відаць амаль з усіх кропак агляду. На яе пазіраеш вялізнымі вачыма. Узнікае адчуванне, што яна ляціць. А што тычыцца футбола, дык для бразільцаў — гэта ўсё! Куды ні кінеш позірк, паўсюль развешаны бразільскія сцягі, ходзяць людзі, апранутыя ў жоўтыя футболкі з прозвішчам Нэймар на спіне.

— Як разумею, у Бразіліі цяпер зіма.

— Так, калі мы прыляцелі, адразу нават не зразумелі, чаму халаднавата, бо разлічвалі на спёку. Нягледзячы на гэта, мы кожны дзень хадзілі на пляж. Акіян быў халодны, імжэў дожджык. Амаль ніхто з бразільцаў не купаўся. Яны наогул хадзілі ў кофтачках і штанах. Але Ягор быў так усцешаны ўбачаным, што з радасцю ў ім плюхаўся і скакаў на хвалях.

— Кажуць, што асноўная праблема для турыстаў — няведанне бразільцамі англійскай мовы.

— Безумоўна. Я таксама з гэтым сутыкнулася. Амаль увесь час мы былі ў акружэнні прадстаўнікоў «МакДональдс» і нашага ахоўніка, прадастаўленага гэтай кампаніяй. Яшчэ загадзя нас пужалі, папярэджвалі пра крымінал, але мы сустракалі даволі ветлівых, адкрытых людзей і, як кажуць, адчувалі сябе ў сваёй талерцы. Некалькі разоў нават заблудзіліся. У такіх сітуацыях на англійскай мове звярталіся да сустрэчных, аднак тыя нічога не разумелі. Пры гэтым яны ўсяляк спрабавалі нам дапамагчы, спынялі другіх бразільцаў і самі пыталіся ў іх пра наш адрас. Іншым разам мы шукалі банк. Блукалі па вуліцах да таго часу, пакуль не сустрэлі пару — мужа і жонку, якія, на шчасце, разумелі англійскую мову. Уявіце сабе: яны нас узялі за ручкі і прыблізна кіламетр вялі да банка. Але мы не ведалі, што, калі там футбол, бразільцы амаль не працуюць. Асабліва тады, калі гуляе зборная Бразіліі. У выніку банк быў закрыты, а грошы нам памяняў наш ахоўнік Эдысан.

РАСІЯНЕ ГУЛЯЛІ ПА ГОРАДЗЕ Ў КАСЦЮМАХ ДЗЕДА МАРОЗА

— На футбол там «хворыя» ўсе?

— Усе! Мы адразу Ягору купілі «Бразуку», афіцыйны мяч чэмпіянату свету, і ён увесь час хадзіў з ім і па крамах, і па кавярнях. У адным з рэстаранаў афіцыянты ўзялі ў яго мяч і пачалі паказваць разнастайныя футбольныя трукі. Гэта выглядала вельмі прыгожа! У мяне склалася адчуванне, што яны там усе паўсюдна гуляюць у футбол. Вось вам яшчэ прыклад. У аэрапорце перад вылетам дадому я вырашыла на хвілінку зазірнуць у краму, а калі вярнулася, убачыла футбольны матч паміж пляменнікам і некалькімі мясцовымі хлопчыкамі.

— А хто з футбольных балельшчыкаў вас найбольш уразіў?

— Уразілі не толькі гледачы, але і сам стадыён «Маракана», на якім мы глядзелі сустрэчу паміж Расіяй і Бельгіяй. Калі трапляеш на гэтую арэну, у цябе губляецца адчуванне рэальнасці. Ён такі вялікі і прыгожы, што па скуры бягуць мурашкі. Балельшчыкі таксама былі непаўторныя. Расіяне, напрыклад, апраналі касцюмы Дзеда Мароза, на галовы нацягвалі будзёнаўкі. Усе знаёміліся, фатаграфаваліся, размаўлялі адно з адным. І гэта была не бітва, а сапраўднае свята. Аднойчы нам пашчасціла выбрацца ў фан-зону. На вялікай сцэне гучала жывая музыка, а людзі слухалі, пілі піва і танцавалі. Усё нечым нагадвала зону для балельшчыкаў на нашым чэмпіянаце свету па хакеі.

— Паводле ўмоў конкурсу, Ягор павінен быў выводзіць на футбольнае поле аднаго з гульцоў зборнай Расіі.

— Ім стаў Дзмітрый Камбараў. Калі дзеці расіян выводзілі футбалістаў зборнай на поле, іх бацькі на трыбунах плакалі. Энергетыка ўзрушала. Перад стартавым свістком Камбараў быў вельмі сур'ёзны. У сваю чаргу, Ягор пажадаў яму ўдачы, на што Дзмітрый падзякаваў яму і паляпаў па плячах.

— Дарэчы, многія газеты пісалі пра тое, што месцы пражывання футбольных зборных ахоўваюць дзясяткі ўзброеных да зубоў паліцэйскіх.

— Каля ўвахода ў нашу гасцініцу таксама стаялі ўзброеныя паліцэйскія. Пэўныя дэталі іх формы наогул нагадвалі рыцарскія латы. Спачатку я здзівілася: «Няўжо ў гасцініцы нешта здарылася?» А пасля зразумела, што нас такім чынам ахоўваюць.

«ТРЭНАЖОРКА» НА АЎТОБУСНЫМ ПРЫПЫНКУ

— Як тамтэйшая кухня ў параўнанні са звыклай нам еўрапейскай?

— Бразільцы любяць чорную фасолю, рэзкія стравы. У нас яны больш посныя. Я таксама паспрабавала на смак блюда з сухога мяса. Гэта, безумоўна, ужо на аматара. Між іншым, раней я лічыла, што лепшую выпечку робяць у Францыі і Італіі, а цяпер зразумела: бразільцы ў гэтым таксама вялікія майстры.

— Ірына, ці пабачылі вы фавэлы, раёны тамтэйшых беднякоў?

— Так, але нічога дрэннага пра стаўленне да нас з боку мясцовага насельніцтва сказаць не магу. Расійскія дзяўчаты, якія пераехалі ў Бразілію на пастаяннае жыхарства, казалі, што ім у гэтай краіне падабаецца і шматлікія негатыўныя аповеды — гэта перабольшанне.

Рыа — горад, у якім жывуць аптымістычныя людзі, якія радуюцца кожнаму дню. І мне здаецца, што гэта не абмяжоўваецца карнавалам і футболам. Мясцовыя жыхары вельмі любяць бегаць. Робяць гэта ў любы час. Як ні зірнеш, а яны ўсё бегаюць і бегаюць — па ўзбярэжжы, з дзеткамі, з сабакамі. Для бегуноў і веласіпедыстаў на праезнай частцы выдзелілі асобную паласу. Нават аўтобусныя прыпынкі абсталяваны адмысловымі трэнажорамі, каб пасажыры не марнавалі часу. Сцены дамоў, платы, лесвіцы распісаны графіці — дарэчы, добра выкананымі. Зразумела, сярод тэм дамінуюць футбол, птушкі, бразільская сімволіка, жанчыны. Мне здаецца, што Мінску падобныя яркія фарбы не перашкодзілі б.

ЗАМЕСТ СЫРУ КУПІЛІ... ЦЕСТА

—Упэўнены, што ў Беларусь вы прыехалі не без футбольных сувеніраў. Колькі што каштавала?

— За мяч мы заплацілі сорак долараў. Усім нашым мужчынам купілі на памяць па майцы Нэймара. За кожную з іх у краме мы выклалі ўжо па дваццаць долараў. Што тычыцца прадуктаў, прывезлі дадому розных ласункаў. Бразільскія цэны мне здаліся нармальнымі. Без кур'ёзаў у супермаркеце таксама не абышлося. Думалі, што панабіралі шмат круглых пачак сыру, а ў выніку гэтыя кругляшы аказаліся цестам, якія проста вельмі падобныя на беларускія сырныя пакункі. Але нічога, будзем пячы. Выпечка, як я ўжо казала, у іх вельмі смачная.

— Мне здаецца, што пяці дзён, якія вы прысвяцілі Рыа-дэ-Жанэйра, усё ж такі недастаткова, каб цалкам зразумець жыхароў горада і ўбачыць усе знакамітыя мясціны.

— Але мы шмат пра што даведаліся, пабачылі акіян, стары горад. З іншага боку, усе Бразілія — непаўторная краіна, а таму туды хочацца вяртацца і вяртацца. Цяпер у нас з Ягорам з'явілася яшчэ адна мара: мы хочам наведаць сапраўдны бразільскі карнавал.

Тарас ШЧЫРЫ.

АПОШНІ КРОК...

Аргенціна вяртаецца ў фінал мундзіялю праз 24 гады

Зборная Галандыі — вечны няўдачнік вырашальных паядынкаў. «Золата» толькі адно — за еўрапейскае першынство-1988. З тых часоў галандцы неаднаразова прабіваліся ў паўфіналы-фіналы чэмпіянатаў Еўропы і свету, але на самы важны крок заўжды не хапала ці то сіл, ці то ўдачы.

Той самы момант, калі «аранжавыя» балельшчыкі разумеюць: іх каманды ў фінале не будзе.

...Не хапіла і ў гэты раз. Будзем шчырымі, матч з аргенцінцамі атрымаўся сумным. Вядома, быў шыкоўны тэмп, двухбаковы прэсінг, роўны час валодання мячом. Але за ўвесь матч каманды стварылі па адным добрым моманце! Прычым Ар'ен Робэн на апошняй хвіліне асноўнага часу мог паставіць кропку ў гэтай сустрэчы. Крыху спазніўся з ударам, выдатна згуляў у падкаце Маскерана — і шанц страчаны. Шанц на фінал.

Пасля матча Уэслі Снайдэр скажа, што серыі пенальці хацела толькі зборная Аргенціны. Напэўна, так і ёсць. У той час, пакуль «аранжавыя» сумняваліся, разважалі «хочам-не хочам», вінавацілі сябе, што ўсё дайшло да «латарэі», аргенцінцы выходзілі і забівалі. Дапамог сваёй камандзе і Серхіа Рамэра, адбіўшы два пенальці. А вось малады самаўпэўнены галкіпер галандцаў Яспер Сілесен, які ўвесь матч быццам выпрабоўваў лёс, небяспечна гуляючы з сапернікам і дэманструючы выдатную псіхалагічную падрыхтоўку, у адказны момант не абараніў свае вароты. «Калі б у мяне была магчымасць замяніць галкіпера, я б гэта зрабіў, — бедаваў на прэс-канферэнцыі трэнер «аранжавых» Луі Ван Гал. — Але да серыі пенальці, на жаль, я ўжо выкарыстаў усе тры замены». Не справіўся варатар, пралічыўся з заменамі трэнер (нешанцаванне?) — фінал «сплыў».

Складана сабе ўявіць, але апошні раз зборная Аргенціны была ў фінале мундзіялю ў 1990 годзе! І вось яно, вяртанне. Так, свой шлях яна прайшла не так элегантна, як Галандыя (памятаеце перамогу «аранжавых» над іспанцамі і выратаванне ў апошні момант з мексіканцамі?). Так, «нябесна-блакітныя» пакуль не дэманстравалі на турніры яркі чэмпіёнскі футбол. Але іх упэўненасць ва ўласных сілах, дзесьці нават не «паўднёвы» прагматызм і амаль што ідэальнае ўзаемаразуменне адзін аднаго на полі сапраўды ўражваюць. Галоўны трэнер аргенцінцаў Алехандра Сабелья не сумняваецца, што яго падапечныя здольны выйграць гэты чэмпіянат. А вось Ар'ен Робэн своеасабліва «пажадаў поспеху» сапернікам па паўфінале: «Упэўнены, Германія — чэмпіён свету. У Аргенціны няма шанцаў». «Бундэсманшафт», відавочна, пачала гуляць на максімуме ў паўфінале з бразільцамі. Аргенцінцы ж, здаецца, прыхавалі самае цікавае на фінальны матч. Самы час даставаць з кішэні чэмпіёнскую гульню!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Рэакцыя Серхіа Рамэра на пераможны пенальці Максі Радрыгеса.

Даты Падзеі Людзі

1903 год — нарадзіўся выдатны савецкі разведчык-нелегал Рудольф Іванавіч Абель (сапраўднае імя — Вільям Генрыхавіч Фішэр). ФБР і да сённяшняга дня лічыць яго арышт сваім подзвігам, падрабязна распісваючы, як на працягу 4 гадоў скрупулёзна спрабавала яго вылічыць. Але ісціна значна больш простая і больш сумная: Абель быў раскрыты ў выніку здрады. Усе гучныя шпіёнскія справы ў Амерыцы — вынік, як правіла, не дзейнасці контрразведкі, а паказанняў перабежчыкаў і здраднікаў. Абель працаваў у ЗША 10 гадоў, аб створаных ім на амерыканскім кантыненце агентурных сетках дагэтуль існуюць толькі здагадкі. Абель трапіў у Штаты з пашпартам на імя Эндру Каёціса, быў арыштаваны як Эміль Голдфус, назваўся пры арышце палкоўнікам Абелем, узяўшы імя свайго нядаўна памерлага сябра і паплечніка латыша Рудольфа Абеля. З гэтым іменем ён быў асуджаны да 30 гадоў турмы, у 1962 годзе абменены на лётчыка-шпіёна Паўэрса і з ім жа стаў вядомы ўсяму Савецкаму Саюзу пасля выхаду фільма «Мёртвы сезон». Пра тое, што Абель з расійскіх немцаў і насамрэч ён — Фішэр, што нарадзіўся ў Англіі, што працаваў за мяжой яшчэ да вайны (выходзіў на будучага акадэміка Капіцу), што ў Вялікую Айчынную прымаў удзел у радыёгульнях з немцамі — пра ўсё гэта стала вядома толькі нядаўна, а звесткі аб яго нелегальнай дзейнасці да гэтага часу не падлягаюць апублікаванню.



1925 год — нарадзіўся (г.п. Карэлічы) Андрэй Аляксандравіч Богуш, беларускі вучоны-фізік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1994), доктар фізіка-матэматычных навук (1975), прафесар (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988) за цыкл работ «Класічная палявая тэорыя элементарных часціц». Аўтар больш за 250 навуковых прац па тэарэтычнай фізіцы і фізіцы высокіх энергій. Распрацаваў эфектыўныя тэарэтыка-групавыя і алгебраічныя метады. Многія важныя фізічныя вынікі ў галіне фізікі элементарных часціц атрыманы ў працэсе ўдзелу ў рэалізацыі міжнародных эксперыментальных праграм па фізіцы высокіх энергій на паскаральніках Дубна, Серпухава і Жэневы.

1932 год — нарадзіўся (горад Барысаў) Анатоль Аляксандравіч Анікейчык, беларускі скульптар, прафесар (1981), народны мастак Беларусі (1972). Працаваў у галіне манументальнай і станковай скульптуры. Стварыў мемарыялы «Праклён фашызму», «Прарыў», помнікі М. Гастэлу і яго экіпажу, А. Матросову. Сярод іншых работ: фантаны «Юнацтва» каля касцёла на пл. Незалежнасці і «Купалінкі» ў парку імя Я. Купалы; партрэты Л. Бетховена, П. Машэрава, Г. Ахматавай і іншых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974). Памёр у 1989 годзе.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:

«Усё на свеце бяжыць і не варочаецца. Не траць дарэмна і мінуты жыцця, бо не вернеш яго».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.52	21.38	16.46
Віцебск	4.33	21.35	17.02
Магілёў	4.42	21.28	16.46
Гомель	4.47	21.16	16.29
Гродна	5.09	21.51	16.42
Брэст	5.18	21.43	16.25

Месяц

Поўня 12 ліпеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Германа, Івана, Паўла, Сяргея.*
К. *Вольгі, Карыны, Пелагеі, Бенядзікта, Пятра.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+21..+24°С	КІЕЎ	+23..+25°С	РЫГА	+20..+22°С
ВІЛЬНЮС	+19..+21°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+16..+18°С

УСМІХНЕМСЯ

Дзеці — кветкі жыцця :)
— Тата, а ты яшчэ вырасцеш?
— Не, сынок.
— А навошта ты тады ясі?

Сквапнасць — гэта калі хочацца штонебудзь падарыць, але няма чаго...

Калі ў вас не ладзіцца кантакт з таксістам, паглядзіце ў акно і скажыце: «Давялі краіну!»

Займальная гутарка да канца паездкі гарантавана.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.961. Індэкс 63850. Зак. № 2836.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 ліпеня 2014 года.